WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

24 ВЕРАСНЯ 2010 г.
ПЯТНІЦА
№ 187
(26795)

Кошт 650 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

Дарагія сябры!
Ад усёй душы віншую вас
з 90-годдзем камсамола Беларусі.

Ленінскі Камуністычны Саюз Моладзі Беларусі стаў для многіх пакаленняў юнакоў і дзяўчат сапраўднай школай, якая дала жыццёвыя ўрокі мужнасці, дабра і справядлівасці.

Паважаныя ветэраны беларускага камсамола! Асабістым прыкладам вы даказалі, што моладзь ва ўсе часы з'яўляецца не толькі пераемнікам гістарычнай спадчыны, але і стваральнікам, які будуе сучаснае і будучае сваёй краіны. Няхай жа ніколі не пакідае вас дух камсамольскага брацтва!

Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі ўпэўнена прыняў эстафету ў свайго папярэдніка і працягвае слаўны летапіс моладзевага руху. Радасна, што яго старонкі напоўненыя канкрэтнымі справамі.

Жадаю вам, дарагія сябры, поспехаў у працы і вучобе, невычэрпнай энергіі, юнацкага задору ў дасягненні мэт, шчасця і дабрабыту.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.

АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ЗАПАТРАБАВАЎ ПРЫКЛАСЦІ МАКСІМАЛЬНЫЯ НАМАГАННІ ДЛЯ ЗАБЕСПЯЧЭННЯ ЗАХАВАНАСЦІ АТРЫМАНАГА ЎРАДЖАЮ

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ўчора ў час рабочай паездкі ў Мінскую вобласць запатрабаваў прыкласці максімальныя намаганні для забеспячэння захаванасці атрыманага ўраджаю, перадае карэспандэнт БЕЛТА.

У прыватнасці, кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу на ўмовы захоўвання бульбы, падкрэсліўшы недапушчальнасць захоўвання ўраджаю ў буртах, дзе, паводле статыстыкі, за зіму страчваецца да 40 працэнтаў закладзенага ўраджаю. «Мы недапушчальна шмат страчваем ад таго, што вырошчваем», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. У якасці вырашэння праблемы кіраўнік дзяржавы даручыў максімальна загрузіць пустуючыя збудаванні, пераабсталяваўшы іх для захоўвання бульбы. Аналагічнага падыходу неабходна прытрымлівацца і пры забеспячэнні захаванасці іншай агародніны. «Знайдзі ў Слуцку, Барысаве, Мінску месцы», — сказаў Прэзідэнт, звяртаючыся да старшыні Мінскага аблвыканкама Барыса Батуры.

Аляксандр Лукашэнка таксама падкрэсліў, што фінансаванне ў сельскай гаспадарцы будзе перабудоўвацца пад найбольш прарыўныя праекты. Ён прывёў у якасці прыкладу вырошчванне такіх відаў культур, як вінаград, журавіны, брусніцы і нават даволі экзатычныя для Беларусі кавуны. Як паказала практыка, нават апошнія могуць цалкам паспяхова вырошчвацца ў рэспубліцы.

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка даручыў дасканала прапрацаваць перспектывы рэалізацыі беларускага цукру на знешніх рынках, улічваючы планы па павелічэнні вытворчасці гэтага віду прадукцыі ў рэспубліцы. «Пытанне ў тым, ці трэба нам павялічваць аб'ём вытворчасці цукру. Трэба ісці не ад таго, што ў нас ёсць зямля і колькі мы можам вырошчваць (цукровых буракоў. **— Заўвага БЕЛТА**), а ісці ад рынку. А калі не купяць?» — задаў пытанне кіраўнік дзяржавы. У прыватнасці, абмяркоўвалася неабходнасць будаўніцтва ў Беларусі новага цукровага завода (цяпер у рэспубліцы працуе чатыры такія прадпрыемствы). Як далажыў кіраўніку дзяржавы віцэ-прэм'ер Іван Бамбіза, завод у выпадку канчатковага прыняцця рашэння аб яго будаўніцтве, плануецца размясціць у Магілёўскай вобласці паблізу Бабруйска. На думку ўрада, яшчэ адзін завод дасць магчымасць значна скараціць тэрміны перапрацоўкі цукровых буракоў, што станоўча паўплывае на аб'ём выпуску канчатковага прадукту.

Аднак, як далажылі Прэзідэнту, у рэспубліцы ёсць значны патэнцыял для павелічэння аб'ёмаў цукру і без будаўніцтва новага, даволі дарагога, прадпрыемства. Гэтага можна дасягнуць, павышаючы ўраджайнасць і цукрыстасць буракоў. Так, у 2015 годзе плануецца павысіць сярэднюю ўраджайнасць цукровых буракоў у гаспадарках Беларусі з цяперашніх 460 ц/га да 520 ц/га. За кошт выкарыстання інтэнсіўных тэхналогій у сельскай гаспадарцы таксама павінна павялічыцца сярэдняя цукрыстасць з 16 працэнтаў да 18 працэнтаў. «Трэба давесці існуючыя заводы да ладу. Калі ёсць магчымасць — развіваць іх магутнасці, вызначыць рынкі і ў канцы гэтага ланцужка вырашыць, ці трэба будаваць новы завод», — падкрэсліў Прэзідэнт, адзначыўшы, што Беларусь з'яўляецца не адзіным і тым больш далёка не самым буйным вытворцам цукру ў свеце, а спрыяльная сітуацыя на рынку гэтага віду прадукцыі ў перспектыве можа змяніцца.

Кіраўнік дзяржавы таксама звярнуў увагу, што калі будзе прынята рашэнне аб будаўніцтве новага цукровага завода, то гэта трэба зрабіць у найбольш сціслыя тэрміны, на працягу прыкладна двух з паловай гадоў. Пры гэтым неабходна паралельна весці прапрацоўку рынкаў збыту і стварэнне сыравіннай зоны. Гаворачы аб рынках збыту, Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што для забеспячэння гарантаваных паставак беларускага цукру на экспарт, можна падумаць аб прыцягненні ў цукровую галіну рэспублікі замежных інвестараў. Аднак гэта павінна адбывацца выключна на ўзаемавыгаднай конкурснай аснове. «Садзіцеся і думайце», — сказаў Прэзідэнт прысутным чыноўнікам, падводзячы вынік размове аб мэтазгоднасці будаўніцтва новага цукровага завода.

Старшыня Прэзідыума НАН Беларусі Міхаіл Мясніковіч таксама далажыў кіраўніку дзяржавы аб рабоце, якую праводзяць вучоныя па селекцыі айчынных гібрыдаў цукровых буракоў. Цяпер пасевы цукровых буракоў у асноўным складаюць гібрыды замежнай селекцыі. Да 2015 года плануецца прыкладна напалову забяспечыць рэспубліку насеннем гэтай культуры ўласнай вытворчасці. Цяпер разгорнута работа па стварэнні айчынных гібрыдаў цукровых буракоў, што дасць магчымасць часткова скараціць імпарт насення.

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка паставіў задачу пашырыць магутнасці цукровых заводаў. Такое даручэнне ён даў учора, наведваючы ААТ «Гарадзейскі цукровы камбінат». «Па цукры ў нас адпрацавана сістэма, структура, ёсць куды пашырацца. Таму першае, што неабходна рабіць, гэта павялічваць аб'ёмы вытворчасці на існуючых прадпрыемствах», — сказаў кіраўнік дзяржавы. Цяпер у краіне функцыянуюць чатыры цукровыя заводы: у Скідзелі, Жабінцы, Слуцку і Гарадзеі. Цукровая галіна рэспублікі тэхнічна перааснашчана і забяспечвае ўстойлівую вытворчасць. У суткі перапрацоўваецца 26,8 тыс. тон буракоў. Пачынаючы з 2004 года, Беларусь выйшла на забеспячэнне цукрам за кошт уласных сыравінных рэсурсаў. Сярод краін СНД яна займае па вытворчасці цукру з цукровых буракоў трэцяе месца пасля Расіі і Украіны. Значна пашырыўся асартымент цукровай прадукцыі. У 2009 годзе экспарт склаў амаль 440 тыс. тон цукру.

СТАР. 2

МАЛЕЦКІ СКАРБ

Пенсіянеры з вёскі Малеч Бярозаўскага раёна Мікалай і Зоя ПАЛЕЙКІ атрымалі сёлета неблагі ўраджай другога хлеба: з 40 сотак яны накапалі больш чым 4 тоны бульбы. Былыя сельскія ветэрынар і бухгалтар лічаць, што гатунак «Скарб» заўсёды ўраджайны і добра захоўваецца, калі, вядома, па-гаспадарску даглядаць яго ад пасадкі да копкі.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

СА «ЗВЯЗДОЙ» — ПА ЖЫЦЦІ!

ЗАКАНЧВАЕЦЦА ПАДПІСКА НА IV КВАРТАЛ 2010 г.

Падпіска праз РУП «Белпошта» (кошт у рублях)

Індэкс	*месяц*	*IV квартал*
63850 (індывідуальны)	12400	37200
63145 (інд. для ветэранаў вайны, пенсіянераў)	11600	34800
63858 (ведамасны)	19900	59700
63239 (ведамасны, для ўстаноў міністэрстваў аховы здароўя, адукацыі і культуры)	18000	54000

Заставайцеся з намі!

Прамая лінія

ЯК ЗМАГАЦЦА З «НЯПРАВІЛЬНЫМ» ЦІСКАМ?

На гэтае і іншыя пытанні адкажа падчас нашай чарговай «прамой лініі» **кандыдат медыцынскіх навук, вядучы навуковы супрацоўнік лабараторыі артэрыяльнай гіпертэнзіі РНПЦ «Кардыялогія» Марыя Міхайлаўна ЛІВЕНЦАВА**.

«Прамая лінія» з яе ўдзелам адбудзецца **сёння з 12.00 да 13.00** па нумарах 8 (017) 292 38 92 і 292 38 21. Папярэднія пытанні можна пакінуць па нумарах 8 (017) 287 18 29 і 287 18 36.

У Беларусі павышаць тарыфы на жыллёва-камунальныя паслугі пакуль не плануецца

Аб гэтым паведаміў учора журналістам начальнік управлення жыллёвай гаспадаркі Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі Эдмунд ГРЫШКЕВІЧ, перадае карэспандэнт БЕЛТА.

Пры гэтым Эдмунд Грышкевіч адзначыў, што памер камунальных плацяжоў павялічыцца за кошт такой прадастаўленай паслугі, як цяпло. «Іншымі словамі, у жыроўцы проста дабавіцца пункт «Ацяпленне», — расказаў прадстаўнік Мінжылкамгаса.

Так, у ацяпляльны перыяд сярэдні плацеж за двухпакаёвую кватэру плошчай 48 кв.м (з трыма пражываючымі) складзе каля Br162 тыс., трохпакаёвую — Br226 тыс., аднапакаёвую — Br108 тыс.

Эдмунд Грышкевіч падкрэсліў, што цяпер беларусы аплачваюць каля 30 працэнтаў затрат на жыллёва-камунальныя паслугі.

Яшчэ пару дзён бабінага лета

Надвор'е

На наступным тыдні пахаладае і дажджы

Сёння і на выхадныя на тэрыторыі Беларусі ўсталюецца спакойнае сонечнае надвор'е без дажджоў, паведаміў рэдакцыі начальнік службы гідраметэапрагнозаў Рэспубліканскага гідраметэацэнтра Дзмітрый РАБАЎ.

У гэтыя тры дні будзе сапраўды камфортна, бо тэмпература паветра ўначы 5—11 цяпла, а ўдзень — ажно 17—23 градусы. Уначы і раніцай у асобных раёнах туман. Толькі ўдзень у нядзелю месцамі па паўднёвым захадзе пройдуць кароткачасовыя дажджы.

А вось з панядзелка надвор'е сур'ёзна сапсуецца. З боку Польшчы на тэрыторыю Беларусі завітае актыўны цыклон, услед за якім да нас пачне паступаць халоднае паветра паўночных шырот. У панядзелак, аўторак і сераду паўсюдна па краіне пройдуць дажджы. Тэмпература ўначы ў панядзелак 7—13, удзень — 12—19, на паўднёвым усходзе яшчэ да 21 градуса. Удзень у аўторак — 10—12 на паўночным захадзе і да 17—19 градусаў на паўднёвым усходзе. У сераду ўдзень толькі 7—14 цяпла. Пахмурна, сыра і дажджы, дажджы, дажджы.

Сяргей КУРКАЧ.

РТУЦЬ СА «ЗНАКАМ ЯКАСЦІ»

На тэрыторыі арматурна-фармовачнага цэха РУП «Завод жалезабетонных вырабаў» у Рагачове знойдзены металічны цыліндр памерам 30х15 см са сталі, у якім знаходзілася ртуць.

Як паведамілі ў прэс-службе абласнога ўпраўлення МНС, рэчыва заважыла каля 3 кг. Частка небяспечнага металу разлілася на паверхню жалезабетоннай пліты. Выратавальнікамі былі праведзены работы па дэмеркурызацыі, ртуць канфіскаваная для наступнай утылізацыі. У прэс-службе УУС Гомельскага аблвыканкама адзначылі: устаноўлена, што такія цыліндры ўстанаўліваліся на апараты кропкавай зваркі яшчэ ў часы СССР. Прынамсі, на ёмістасці стаіць «Знак якасці».

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

НЕ ПАСПЕЎ СПЫНІЦЦА... НА ТРАКТАРЫ

У 23.25 на тэрыторыі Мінскага трактарнага завода кіроўца трактара наехаў на пешахода. Апошні пераходзіў праезную частку па нерэгулюемым пешаходным пераходзе.

— Кіроўца трактара патлумачыў, — паведаміў старшы інспектар аддзела па агітацыі і прапагандзе УДАІ ГУУС Мінгарвыканкама Юрый КРАСНОЎ, — што пры павароце направа ён прыкмеціў чалавека, які перабягаў дарогу, але спыніцца не паспеў. У выніку ДТЗ пешаход 1960 года нараджэння атрымаў адкрытую чэрапна-мазгавую траўму, удар галаўнога мозгу, пералом зводу чэрапа...

Надзея ДРЫЛА.

УСПЫХНУЎ ГАЗ

Гаспадар прыватнага дома па вул. Мічурына ў Баранавічах вырашыў разагрэць ежу і запаліў гарэлку пяцілітровага газавага балона.

Шуганула полымя. 9-гадовая ўнучка, якая знаходзілася ў доме, паспела выбегчы і паклікала суседзяў. Яны і выцягнулі абгарэлага дзеда з хаты. Пацярпелага адвезлі ў бальніцу, дзе ён памёр ад шматлікіх апёкаў. Пажар пашкодзіў дом і маёмасць.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

СЯРЭДНЯЯ ЗАРПЛАТА РАБОТНІКАЎ БЕЛАРУСІ Ў ЖНІЎНІ СКЛАЛА BR1 МЛН 286 ТЫС. 851

Паведамілі ў Нацыянальным статыстычным камітэце. Гэты паказчык у ліпені 2010 года быў роўны Br1 млн 282 тыс. 757. Налічаная сярэдняя заработная плата рабочых і служачых у жніўні гэтага года склала Br1 млн 301 тыс. 962 (у ліпені яна была Br1 млн 298 тыс. 628).

Кар. БЕЛТА.

ІНТЭРНЭТ НАТХНІЎ ЗМАГАЦЦА З... ГРАШЫМА

Падлетак з Віцебскага раёна, нагуляўшыся ў віртуальныя гульні, вырашыў «змагацца з ліхам». Ён пайшоў у краму і металічнай палкай ударыў гандляра па галаве. Работніка гандлю з цяжкім раненнем шпіталізавалі. Пасля затрымання хлопец растлумачыў, што пры дапамозе «віртуальнага павуціння» зразумеў, што грошы — гэта ліха, якое трэба знішчыць.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

«РЭШТКІ ЦУКЕРАК ЗНЯТЫЯ З ПРОДАЖУ, АСТАТНІЯ ТАВАРЫ ПРАВЯРАЮЦЦА. САНСТАНЦЫЯ ПРАВЯДЗЕ Ў КРАМЕ АПРАЦОЎКУ»

«ГАРАЧЫ» 287 17 41

Ад гісторыі, пра якую распавяла мінчанка, што вярталася ўвечары ў мінулую нядзелю ў сталіцу праз Іўе, яе ж саму найперш і трэсла. Гэта пры тым, што пасля здарэння ўжо прайшло некалькі дзён. Але ж гаворка ішла пра здароўе сына — уявіце пачуцці маці. А здарылася наступнае.

— У Іўі на плошчы зайшлі ў краму спажывецкай кааперацыі — колішні ўнівермаг. Апроч іншага, набылі і недзе з паўкілаграма цукерак «Чарнаморачка». Калі дабраліся дадому, сын, які вельмі любіць салодкае, узяў пакет з цукеркамі і, не ўключаючы ў пакоі святла, уладкаваўся перад манітором камп'ютара. Раніцай я налічыла недзе з 15 абгортак — столькі цукерак ён паспеў з'есці за вечар. Але, калі я пабачыла тую «Чарнаморачку» пры дзённым святле, мне літаральна зрабілася дрэнна: цукеркі былі ў павуцінні, цвілі, на іх нават былі чэрві! Сыну я, вядома, нічога не сказала, схавала ад яго тыя цукеркі, хоць ён і пытаўся на наступны дзень, ці засталося салодкае. Каб не адлегласць у 120 кіламетраў, шчыра скажу, было жаданне паехаць у тую краму і кінуць гэтыя цукеркі ў твар прадаўцу. Як так можна? Сын — доўгачаканае дзіця, шмат хварэў. Зараз не ведаю, што рабіць: звяртацца да ўрачоў ці не? Наколькі тыя цукеркі былі небяспечнымі для яго здароўя? Думаю, як мінімум, прадаўца трэба прыцягнуць да адказнасці, — гаварыла нам заяўніца. А калі эмоцыі некалькі суціхлі, папрасіла, каб проста знялі тую «Чарнаморачку» з продажу — каб яшчэ нехта выпадкова не пацярпеў.

У той жа дзень мы звязаліся з Іўеўскім раённым спажывецкім таварыствам, якому і належала крама, дзе ўсё і адбылося, — «Вікторыя». Дамовіліся, што праверка выкладзеных фактаў будзе праведзена як мага больш аператыўна, гэтак жа, як і будуць прынятымі адпаведныя меры, калі ў тым ёсць патрэба. Ужо да абеду наступнага дня ў рэдакцыю патэлефанавала спачатку дырэктар рознічна-гандлёвага прадпрыемства таварыства Наталля БЕЛАГАЛОВА, а праз нейкі час — і старшыня рэвізійнай камісіі таварыства Людміла ГАЛАВЕНКА.

Факты пацвердзіліся. Пры знешнім аглядзе рэштак цукерак «Чарнаморачка» (пасля зняцця абгортак) была знойдзеная кандытарская моль. Таму тое, што заставалася, тут жа было знятым з продажу — 5,1 кілаграма цукерак на суму 56,2 тысячы рублёў. Загадчык крамы павінна будзе ўнесці гэты кошт у цэнтральную касу спажывецкага таварыства: пакрыць нанесеную шкоду. Акрамя таго, у яе дачыненні рыхтуецца распараджэнне аб прыцягненні да дысцыплінарнай адказнасці, што, у сваю чаргу, можа адбіцца на памеры прэміяльных.

— Кандытарская моль лятае ноччу, крыніцу вельмі цяжка вызначыць, — патлумачыла старшыня рэвізійнай камісіі таварыства Людміла Галавенка. — Такія выпадкі, як мы заўважылі, здараюцца пасля працяглага спякотнага лета. Канкрэтная віна работніка крамы ў наступным. Калі яна прыняла запачатаны тавар з усімі неабходнымі дакументамі, ён нейкі час захоўваўся на складзе крамы. Дарэчы, мы праверылі — тэрмін захоўвання цукерак не выйшаў. Але перад тым, як накіраваць у гандлёвую залу новую партыю тавару для рознічнага гандлю, работнік павінен быў тавар ускрыць і пераканацца, што за час захоўвання ў складскім памяшканні з ім нічога не адбылося. Яна гэтага не зрабіла.

Паводле далейшых слоў Людмілы Іванаўны, зараз у «Вікторыі» правяраюць іншыя тавары, што знаходзіліся побач з тымі цукеркамі. Для гэтага на працу раней выклікалі ўсіх работнікаў. Пасля будзе зроблены зварот у санстанцыю, каб тая апрацавала гандлёвую залу і складское памяшканне спецыяльнымі растворамі.

Наталля Белагалова і Людміла Галавенка прынеслі прабачэнні заяўніцы за тое, што здарылася з ёй і яе сынам: «Гэта выключны выпадак, такое здараецца не часта». Людміла Іванаўна патэлефанавала на кандытарскую фабрыку, дзе ёй сказалі, што такая моль — гэта хутчэй непрыемна, чым небяспечна для здароўя. Тым не менш суразмоўцы, не адмаўляючы праз тое віны, прапанавалі жанчыне, калі ў яе будзе такое жаданне, звязацца са спажывецкім таварыствам, каб яго работнікі маглі асабіста папрасіць прабачэння.

Сяргей РАСОЛЬКА.

АУКЦИОНЫ ПО ПРОДАЖЕ КОММЕРЧЕСКОЙ НЕДВИЖИМОСТИ

WWW.RLT.BY

КУП «Минский областной центр учета недвижимости» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Зеленоборское» (продавец)

проводит повторный открытый аукцион по продаже объектов недвижимости, расположенных по адресу: **Минская обл., Смолевичский район, п. Зеленый Бор**, в составе:

Лот № 1 – производственное здание № 1 (котельная) пл. 164,6 кв.м, начальная цена с НДС (снижена на 50 %) – 25 630 554 бел. руб.

Площадь земельного участка – **0,4047 га.**

Лот № 2 – теплица пл. 761 кв.м, начальная цена с НДС (снижена на 50 %) – 30 969 367 бел. руб.

Площадь земельного участка – **0,1632 га.**

Задаток 10 % от начальной цены.

Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 14.08.2010.

Аукцион состоится **05.10.2010** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **04.10.2010** до 17.00 по указанному адресу.

Тел.: (8017) 224 61 34, 500 47 12.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ФРАНЦЫЯ ЗНОЎ БАСТУЕ

У Францыі пачалася чарговая маштабная забастоўка — у краіне не ходзіць транспарт, скарочаныя авіярэйсы. Французы пагражаюць баставаць аж да 5 кастрычніка, калі законапраект будуць разглядаць у сенаце.

У чацвер больш за два мільёны французаў выйшлі на вуліцы Парыжа і іншых буйных гарадоў, заяўляючы сваё негатыўнае стаўленне да законапраекта аб пенсійнай рэформе, які цяпер знаходзіцца ў стадыі ўзгаднення. Дакумент прадугледжвае павышэнне ўзросту выхаду на пенсію з 60 да 62 гадоў. Бастуюць дзяржаўныя і прыватныя службоўцы. У краіне зачыненыя школы і ўніверсітэты. З перабоямі працуе грамадскі транспарт. На масавыя маніфестацыі народ паднялі буйнейшыя прафсаюзы краіны.

ПЕНСІІ СЛУЖБОЎЦАЎ У РАСІІ Ў ДВА РАЗЫ БОЛЬШЫЯ, ЧЫМ У ЗВЫЧАЙНЫХ ПЕНСІЯНЕРАЎ

Прэзідэнт Расіі Дзмітрый Мядзведзеў падпісаў указ аб пераліку пасад, за працу на якіх службоўцы атрымліваюць права на пенсію федэральных дзяржслужачых. У выніку апошніх змен іх пенсійныя выплаты будуць у два разы большыя ў параўнанні са звычайнымі пенсіянерамі.

Указ вызначае пасады, якія адносяцца да разраду найважнейшых (яны забяспечваюць сацыяльную абарону па вышэйшым разрадзе). Спіс уключае асобаў, якія займаюць і займалі дзяржаўныя пасады ў Расіі або яе суб'ектах, пасады ў адміністрацыі прэзідэнта, Савеце бяспекі, а таксама федэральных органах заканадаўчай улады і іх апаратах. Ва ўказе напісана, што службоўцы, якія адпрацавалі на дзяржслужбе не менш за 15 гадоў, атрымліваюць пенсію ў памеры 45 % ад сярэднямесячнага заробку. Пры гэтым за кожны год звыш згаданага тэрміну ім дадаецца яшчэ па 3 %, але ў выніку не павінна атрымацца больш за 75 % ад зарплаты. Што датычыцца іншых пенсіянераў, цяпер яшчэ толькі ставіцца задача давесці памер пенсіі да 40 % ад сярэдняга прыбытку. Цяпер памер дзяржаўнай пенсіі ў федэральных службоўцаў складае каля 11 тысяч расійскіх рублёў.

У МАСКВЕ З БАНКАЎСКАЙ СКРЫНІ ВЫКРАЛІ $3,3 МІЛЬЁНА

Крадзеж адбыўся ў перыяд з 6 па 22 верасня. Грамадзянін, які арандаваў скрыню ў банку на Смаленскім бульвары, звярнуўся ў міліцыю 22 верасня.

Скрыню арандаваў 40-гадовы масквіч. 3,3 мільёна долараў ён атрымаў у выніку продажу кватэры. Міліцыянеры мяркуюць, што грошы мог выкрасці пакупнік кватэры. Ён суправаджаў прадаўца, калі той укладваў грошы ў скрыню. Таксама ў дачыненні да крадзяжу падазраюць супрацоўнікаў банка.

ПАЛІЦЫЯ АПЛАЦІЦЬ РАМОНТ МАШЫНЫ П'ЯНАГА КІРОЎЦЫ

Паліцыі Жэневы прыйшлося пакрыць рамонт машыны п'янага кіроўцы, у якую ўрэзаліся супрацоўнікі паліцыі на службовым аўтамабілі.

Аўтамабілі сутыкнуліся на перакрыжаванні на паўднёвым усходзе Жэневы. У выніку сур'ёзна пацярпеў супрацоўнік паліцыі. Першапачаткова вінаватым у ДТЗ быў прызнаны пенсіянер, які знаходзіўся за рулём у стане алкагольнага ап'янення. У яго крыві было выяўлена 2,98 праміле алкаголю,

ЦЯГНІК УРЭЗАЎСЯ Ў СТАТАК СЛАНОЎ

Інцыдэнт адбыўся ў індыйскім штаце Заходняя Бенгалія. У выніку сутыкнення таварнага цягніка са статкам слановаў загінулі сем жывёл, яшчэ адна асобіна атрымала раненні.

Прычынай сутыкнення стала ўзаемадапамога буйных млекакормячых. На чыгунцы затрымаліся два слаганяці, а дарослыя члены статка спрабавалі іх вызваліць, калі на гарызонце з'явіўся цягнік. Пяць слановаў загінулі адразу, яшчэ двое памерлі ад ран пазней. На ўчастку чыгункі быў на некалькі гадзін перакрыты рух, бо слоны, якія засталіся ад статка, доўгі час не падпускалі да загінулых суродзічаў людзей.

ЗАГІНУЛІ ПАСАЖЫРЫ...

у тым ліку і імяніннік

22-гадовы вадзіцель на бацькоўскім аўтамабілі «ГАЗ 3110» не справіўся з кіраваннем і наехаў на асвятляльную мачту. Няшчасце адбылося недзе ў гадзіну ночы ў Мінску на перасячэнні праспекта Пушкіна з вуліцай Прытыцкага. У выніку наезду 25-гадовы і 29-гадовы пасажыры (адзін з іх нарадзіўся ў гэты дзень) загінулі на месцы здарэння, а кіроўца шпіталізаваны. Апошні, як паведамілі ў УДАІ ГУУС Мінгарвыканкама, знаходзіўся нападпітку.

Надзея ДРЫЛА.

ПРОДАЖА НА ТОРГАХ ЗДАНИЙ И ПОМЕЩЕНИЙ

КУПП «Виттекс»

(36 кв. м; 40,8 кв. м; 793,9 кв. м; 1042,7 кв. м; 1207,8 кв. м; 1189,9 кв. м; 2939,2 кв. м) в г. Витебске по ул. Володарского, 100.

ЦЕНЫ СНИЖЕНЫ.

Информация на сайте: www.vitinvest.biz.

Тел.: 431498, +375336480387; +375292962323 МТС.

УНП 300149663

У МАГІЛЁЎ ВЯРНУЛАСЯ СЛУЦКАЕ ЕВАНГЕЛЛЕ

22 верасня на адкрыцці ў Магілёве духоўна-асветніцкай праграмы «Сям'я — яднанне — Айчына» жыхары вобласці атрымалі ў падарунак факсімільнае выданне Слуцкага Евангелля.

Слуцкае Евангелле — помнік пісьменства XVI стагоддзя, адна з самых вялікіх праваслаўных святыняў Беларусі. Гэтае Евангелле перапісаў уласнай рукой князь Юрый Алелькавіч, каб засведчыць сваю адданасць веры і традыцыям продкаў.

Пасля рэвалюцыі нацыянальная рэліквія трапіла ў Мінскі дзяржаўны музей, у сувязі з запланаваным пераносам сталіцы Евангелле перавезлі ў Магілёў. Разам з Крыжам Ефрасінні Полацкай яно захоўвалася ў пакоі-сейфе ў будынку Магілёўскага абкама партыі. У пачатку вайны ўсе каштоўнасці бясследна знікли.

Аднак цудоўным чынам Евангелле было знойдзена ў 2003 годзе. Яго захоўвала ў сябе мінчанка: яна не ўяўляла сабе каштоўнасць гэтай рэчы і падаравала кнігу святару за адпяванне сваяка. Засталося таямніцай, куды рукапіс знік у час вайны і якім чынам трапіў у сям'ю жанчыны.

Тым не менш, Беларусь зноў атрымала ўнікальную гістарычную і духоўную каштоўнасць — Слуцкае Евангелле. Выдавецтва Беларускага Экзархата падрыхтавала і выпусціла ў свет факсімільнае выданне старажытнай кнігі.

— Добра, што ў краіне ідзе духоўнае адраджэнне, — сказаў **намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Валерый МАЛАШКА**, які прыняў падарунак на сцэне Магілёўскага палаца культуры. — Да нас на Магілёўшчыну вярнулася гістарычная каштоўнасць, якая была страчана ў 1941 годзе. Слуцкае Евангелле зноў здабытае.

Духоўна-асветніцкая праграма «Сям'я — яднанне — Айчына» будзе працаваць у Магілёве да 3 кастрычніка. Гэта праект Беларускай Праваслаўнай Царквы, які ажыццяўляецца ў супрацоўніцтве з дзяржавай, рэлігійнымі і грамадскімі арганізацыямі. Мэта праграмы — вырашэнне дэмаграфічных задач: усталяванне сямейных і маральных каштоўнасцяў, традыцыяў хрысціянскага шлюбу і ідэй духоўнага адраджэння нацыі, захаванне нацыянальнай годнасці, шматвяковай культурнай і духоўнай спадчыны. У праграме — кірмаш кніг і царкоўных рэчаў, лекцыі, круглыя сталы, выставы, канцэрты, тэатральныя прадстаўленні, дабрачынны марафон і хрэсны ход, які адбудзецца ў цэнтры Магілёва 26 верасня.

Ілона ІВАНОВА.
Фота Ірыны САВОСІНАЙ.

ISSN 1990 - 763X

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 24.09.2010 г. (для б/н разлікаў)			
1 долар ЗША	3 023,00	1 чэшская крона	164,45
▲ 1 еўра	4 045,08	1 польскі злоты	1020,30
1 латвійскі лат	5 697,86	▼ 1 расійскі рубель	97,51
1 літоўскі літ	1 170,66	1 украінская грыўня	380,87

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ	
USD	31,0031
10 UAH	39,0590
1000 BYR	10,2523
EUR	41,5380

Агенцтва Уладзіміра Грыўцова

АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ЗАПАТРАБАВАЎ ПРЫКЛАСЦІ МАКСІМАЛЬНЫЯ НАМАГАННІ ДЛЯ ЗАБЕСПЯЧЭННЯ ЗАХАВАНАСЦІ АТРЫМАНАГА ЎРАДЖАЮ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Да 2015 года плануецца павялічыць выпуск цукру з бураковай сыравіны да 650 тыс. тон у год. Для павышэння эканамічнай эфектыўнасці галіны неабходна вырашыць шэраг пытанняў, у прыватнасці, павысіць тэхналагічную якасць цукровых буракоў, іх цукрыстасць да 18 працэнтаў і больш, скараціць тэрміны захоўвання і перапрацоўкі цукровых буракоў, забяспечыць збалансаванасць узроўняў нарыхтоўкі цукровабурачнай сыравіны і вытворчых магутнасцяў па яе перапрацоўцы.

Аляксандр Лукашэнка азнаёміўся са станам і перспектывамі развіцця ў цэлым цукровай прамысловасці ў рэспубліцы, а таксама вытворча-эканамічным станам Гарадзейскага цукровага камбіната і перспектывамі яго развіцця, пабываў у вытворчых цэхах і паглядзеў на ўвесь цыкл вытворчасці гэтай прадукцыі.

За сем месяцаў 2010 года ў цэлым прыбытак прадпрыемства склаў Br51,5 млрд, што ў 3,1 раза больш, чым за аналагічны перыяд мінулага года, пры рэнтабельнасці 21 працэнт. Чысты прыбытак склаў Br31,4 млрд. Прадукцыя прадпрыемства актыўна пастаўляецца на экспарт. Так, за студзень—жнівень у Расію было пастаўлена 32,2 тыс. тон цукру, Украіну — 17,9 тыс. тон, Казахстан — 17,7 тыс. тон. Экспарт ажыццяўляецца і ў іншыя краіны СНД, Манголію.

Прэзідэнт пабываў учора таксама на СЗАТ «Еўратарэкс», дзе азнаёміўся з тэхналагічным працэсам вытворчасці ўпаковачных вырабаў.

Юрый ЖАДОБІН:

«Беларусі ўдалося стварыць нацыянальную ваенную школу»

Аб гэтым учора на сустрэчы з кіраўнікамі СМІ заявіў міністр абароны Юрый Жадобін, перадае карэспандэнт БЕЛТА.

У гэтым годзе адбыўся ўжо трэці выпуск факультэта генштаба Ваеннай акадэміі. Сярод выпускнікоў ёсць і прадстаўнікі Казахстана. Юрый Жадобін адзначыў, што гэта краіна мае вялікія рэсурсы і можа выбіраць, у якія менавіта ВНУ будзе накіроўваць сваіх ваенных. Той факт, што яны выбралі менавіта беларускую Акадэмію, сведчыць пра многае.

Міністр звярнуў увагу на створаную ў Беларусі сістэму ваенных факультэтаў на базе грамадзянскіх ВНУ, якая дае магчымасць выкарыстоўваць увесь патэнцыял вышэйшай школы краіны. Пры гэтым ён падкрэсліў, што мала ўзвесці будынак вышэйшай навучальнай установы і аснасціць яго ўсім неабходным, галоўнае — гэта педагагічныя кадры.

Юрый Жадобін таксама нагадаў, што ваенная школа Беларусі ўключае ў сябе і сістэму падрыхтоўкі лётчыкаў, якую ўдалося стварыць далёка не ўсім былым савецкім рэспублікам. Не так даўно ў Беларусі быў створаны вучэбны цэнтр для пілотаў, прычым у рэспубліцы выпускаюцца лётчыкі, якія ўжо маюць пэўны клас, тады як у савецкія часы пілот-навабранец напрацоўваў клас у час службы ў падраздзяленні.

Расійскі ваенна-прамысловы комплекс мае патрэбу ў беларускіх камплетуючых.

«Расійскі ваенна-прамысловы комплекс не можа зрабіць без Беларусі канчатковы прадукт», — сказаў міністр. Ён растлумачыў, што гэта датычыцца, напрыклад, танкаў. Менавіта на беларускіх прадпрыемствах ствараюцца сістэмы кіравання агнём для такой тэхнікі, уключаючы цеплавізары. Акрамя таго, прыцэлы для ўсіх узбраенняў, якія вырабляюцца ў Расіі, таксама пастаўляюцца з Беларусі. Гэта азначае, што Беларусь забяспечвае камплектуючымі не толькі тую тэхніку, якая стаіць на ўзбраенні расійскай арміі, але і ўсю пастаўляемую тэхніку з РФ.

Юрый Жадобін нагадаў, што менавіта на адным з прадпрыемстваў Барысава была асвоена мадэрнізацыя комплексу С-300. Мадэрнізаваныя комплексы ўжо даказалі сваю эфектыўнасць у ходзе нядаўніх вучэнняў на палігоне Ашулук (Расія). Таксама расійскімі калегамі высока ацэнены беларускія аўтаматызаваныя сістэмы кіравання войскамі.

У Беларусі актыўна вядзецца распрацоўка і выпрабаванне ўжо гатовых узораў беспілотных авіякомплексаў. Больш таго, у складзе Узброеных Сілаў ужо створана спецпадраздзяленне, якое будзе выкарыстоўваць гэту тэхніку.

НАШЫ ПАРЛАМЕНТАРЫІ ВЫДАТНА ГУЛЯЮЦЬ У ШАХМАТЫ, ГОЛЬФ І ТЭНІС

Каманда Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь прыняла ўдзел у Другіх гульнях парламентарыяў краін Еўропы. Спаборніцтвы праходзілі ў Маскве пры падтрымцы Федэральнага Сходу і Урада РФ, Мінспорту, турызму і моладзевай палітыкі Расіі, а таксама ўрада Масквы.

У гульнях прынялі ўдзел 120 парламентарыяў з 11 краін — Аўстрыі, Беларусі, Балгарыі, Венгрыі, Латвіі, Літвы, Расіі, Сербіі, Украіны, Харватыі, Чарнагорыі. Нашу каманду ўзначаліў намеснік Старшыні Палаты прадстаўнікоў Віктар Гумінскі.

Спаборніцтвы працягваліся 3 дні па пяці відах спорту — міні-футболе, вялікім і настольным тэнісе, шахматах і гольфе. Зборная каманда парламентарыяў Беларусі прыняла ўдзел ва ўсіх відах спаборніцтваў і ў выніку ўвайшла ў лепшую пяцёрку разам з Літвой, Расіяй, Украінай і Сербіяй. Нягледзячы на алімпійскі прынцып «Галоўнае — не перамога, а ўдзел», беларускія парламентарыі ўпарта змагаліся і змаглі заваяваць 2-е месца ў турніры па настольным тэнісе (А. Кузьміч і М. Касцюк), прапусціўшы наперад толькі каманду Літвы, чацвёртае — па шахматах (С. Крыжэвіч і В. Рабец), пятае — па тэнісе (А. Антоненка і С. Маскевіч) і гольфе (Я. Арцюшэнка).

Падчас гульняў парламентарыям прадаставілася выключная магчымасць сустрэцца ў нефармальнай абстаноўцы, абмеркаваць і многія рабочыя моманты, і захады па ўмацаванні кантактаў. Было прапанавана, напрыклад, расшырыць праграму Гульняў за кошт уключэння ў яе плавання, баскетбола, валейбола, ралі. Ёсць упэўненасць: нашы перамогуць!

Ул. інф.

Абзац

◢ **Народны абрад «Багач» будзе прэзентаваны на фестывалі фальклорнай песні «Прынёманскія напевы», які пройдзе 25 верасня ў вёсцы Орля Шчучынскага раёна.**

◢ ААТ «Расійская чыгунка» з 23 верасня адкрыла новы міжнародны чыгуначны маршрут «Масква-Ніца». Ён будзе праходзіць і па беларускай тэрыторыі — праз Оршу, Мінск, Брэст.

◢ **Беларусь займае 2-е месца сярод імпарцёраў алкагольнай прадукцыі з Малдовы, саступаючы толькі Расіі. Малдова экспартуе амаль 95 % алкагольнай прадукцыі, што вырабляецца ў краіне. Летась гэтая прадукцыя была пастаўленая ў 43 краіны свету.**

◢ Жыхар Гомеля спрабаваў незаконна вывезці ў Расію 10 коней. Увечары 22 верасня ў раёне населенага пункта Леніна памежнікі сумесна з супрацоўнікамі міліцыі затрымалі грузавы аўтамабіль «МАН». У машыне знаходзілася 10 коней без адпаведных дакументаў. Табун незаконна вывозіўся ў Расію.

◢ **Гомельскія памежнікі затрымалі 35 нелегальных зборшчыкаў журавін. Нелегалы, жыхары Украіны, збіралі ягады ў Лельчыцкім раёне і былі затрыманыя ў 3 км ад беларуска-ўкраінскай мяжы. Усе затрыманыя — жыхары ўкраінскага населенага пункта Познань.**

◢ У Маскве стартаваў чэмпіянат свету па караоке. Уладар прыза глядацкіх сімпатый атрымае мільён пельменяў. У першынстве гэтага года прымуць удзел канкурсанты з ЗША, Фінляндыі, Аўстраліі, Канады, Ірландыі, Данії, Казахстана, Беларусі, Расіі і іншых краін. Удзельнікі павінны будуць выканаць перад журы адну і тую ж песню. Паспаборнічаць у спеўным майстэрстве могуць і гледачы — для іх арганізаваны асобныя спаборніцтвы.

Поўны абзац

◢ **Паліцэйскі за жарт заплаціў €7 тыс. Да такога штрафу 28-гадовы аўстралійскі паліцэйскі быў прыгавораны за тое, што замест квітанцыі аб штрафе пакінуў запіску. У красавіку г.г ён адправіўся на пошукі няправільна прыпаркаваных машын. Убачыўшы такую непадалёк ад пешаходнага пераходу, ён заўважыў на заднім шкле вымпел з эмблемай паліцыі. Вартавы парадку палічыў, што ўладальнік машыны мае дачыненне да паліцэйскіх структур і вырашыў пажартаваць. Ён пакінуў вадзіцелю запіску «Падобнае парушэнне абыдзецца табе ў скрыню піва». Вадзіцель прыняў гэта як кіраўніцтва да дзеяння і на наступны дзень прывёз у паліцыю скрыню піва. Паліцэйскі ў той час знаходзіўся на дзяжурстве ў горадзе, а яго калегі не зразумелі жарту і правялі разбіральніцтва, якое завяршылася судом.**

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

Беларусь вывучае магчымасць транспарціроўкі нафты праз парты Латвіі

Пра гэта заявіў учора на прэс-канферэнцыі ў Рызе прэм'ер-міністр Беларусі Сяргей СІДОРСКІ.

Гаворачы пра перспектывы супрацоўніцтва з латвійскімі партамі, Сяргей Сідорскі дадаў, што Беларусь аддасць перавагу таму з іх, які прапануе больш камфортныя і льготныя ўмовы, у тым ліку чыгуначным перавозкам, пастаўцы і апрацоўцы грузаў.

РАЗМЕРКАВАЦЬ МОЖНА. ЗАМАЦАВАЦЬ СКЛАДАНА

Да 2013 года патрэба ў медыцынскіх кадрах будзе закрытая. Праблема недахвату сяродняга медперсаналу і ўрачоў-спецыялістаў сфарміравалася ў папярэднія гады з-за парушэння належнага планавання. Аднак павелічэнне апошнім часам выпуску з чатырох медыцынскіх ВНУ, паступовае паляпшэнне сітуацыі з замацаваннем спецыялістаў на месцах дазваляюць спадзявацца на хуткае выпраўленне сітуацыі.

Паводле слоў намесніка начальніка ўпраўлення кадравай палітыкі ўстаноў адукацыі і знешніх сувязяў Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь Васіля ФІЛАНЮКА, на пачатку года краіне былі патрэбныя каля 4,5 тысячы ўрачоў-спецыялістаў. У параўнанні з мінулым годам патрэба знізілася прыкладна на тысячу. Падобная тэндэнцыя будзе назірацца і далей. Пік недахвату медыцынскіх кадраў мы прайшлі ў 2008 годзе.

На сёння сітуацыя з сярэднім медперсаналам даволі спрыяльна складваецца ў рэгіёнах і крыху напружанай застаецца ў сталіцы. Каля 3,5 тысячы чалавек выпусцілі сёлета 14 медкаледжаў. Патрэба ў такіх спецыялістах задаволеная дзесьці на 60 працэнтаў. Каля 40 працэнтаў памянёных выпускнікоў з ліку пазабюджэтнікаў уладкоўваліся на працу самастойна.

Што да асобаў з вышэйшай медыцынскай адукацыяй, то сёлета на вочнай форме навучання атрымалі звыш 2 тысяч чалавек. 100 працэнтаў выпускнікоў-бюджэтнікаў размеркаваныя на першае месца працы. Скарысталіся магчымасцю накіравання і 90 працэнтаў выпускнікоў-пазабюджэтнікаў. Такім чынам, 1997 выпускнікоў былі накіраваныя на першае месца працы ва ўстановы аховы здароўя і адукацыі сістэмы Міністэрства аховы здароўя. 20 чалавек накіравалі ў арганізацыі аховы здароўя іншых рэспубліканскіх структур (сістэмы Беларускай чыгункі, службу судова-медыцынскай экспертызы і інш.). 42 выпускнікі скарысталіся правам свабоднага працаўладкавання.

Заяўкі на новаспечаныя кадры па рэгіянальных арганізацыях аказаліся выкананымі на 30-60 працэнтаў, па рэспубліканскіх — на 70. Больш за палову выпускнікоў атрымалі сваё першае працоўнае месца ў сельскай мясцовасці і малых гарадах. Каля 12 працэнтаў адправіліся ў рэгіёны, якія пацярпелі ад аварыі на ЧАЭС. У выпадках нежадання прыбываць па накіраваннях у апошнія гады намецілася тэндэнцыя добраахвотнай кампенсацыі сродкаў, затрачаных на падрыхтоўку спецыяліста. Пасля абавязковай двухгадовай адпрацоўкі на першым працоўным месцы застаецца дзесьці 70-80 працэнтаў спецыялістаў. Астатнія з'язджаюць на працягу літаральна паўгода пасля завяршэння абавязковай адпрацоўкі. Наогул пытанне замацавання медыцынскіх кадраў на канкрэтным месцы застаецца актуальным не толькі для нашай краіны. Аднак, па-першае, наўрад ці можна гаварыць аб замацаванні «назаўжды» — хіба пра затрыманне на як мага большы тэрмін. І для гэтага неабходна ўлічваць такія меры, як прадастаўленне жылля, даплат і інш. Але наогул ва ўсім свеце яшчэ ніхто не адмяняў так званы «прынцып даміно», згодна з якім спецыялісты, як і раней, будуць перамяшчацца: з вёскі ў райцэнтр, з райцэнтра ў вобласць, з вобласці ў сталіцу, са сталіцы — ва Усходнюю Еўропу, адтуль — у Заходнюю Еўропу...

Святлана БАРЫСЕНКА.

П'ЯНЫ КІРОЎЦА НА «ВОЛЗЕ» НЕ ЗАЎВАЖЫЎ, ШТО МАШЫНУ ПРАТАРАНІЎ ТУРНІКЕТ

52-гадовы нецвярозы мужчына каля 5.50 гадзін раніцы 23 верасня на аўтамабілі ГАЗ 3110 у Мінску на перакрыжаванні вуліц Багдановіча і Харужай не справіўся з кіраваннем, ударыў святлафор на раздзяляльнай паласе. За ім наехаў на турнікет, частка якога пратараніла днішча і засталася ў багажніку аўтамабіля. Кіроўца паехаў далей — у бок плошчы Бангалор. Ігнаруючы кругавы рух, мужчына выехаў прама на зялёны газон пасярэдзіне плошчы, дзе і спыніўся.

Алена АЎЧЫННІКАВА.

ГАДУЙМА БЕЛАРУСІКАЎ! Прэзентацыя

Сёння, 24 верасня, а 17 гадзіне ў Таварыстве беларускай мовы адбудзецца прэзентацыя незвычайнага аўдыядыска пад знаёмай для многіх назвай «Дзіцячы альбом». Гэта — не Чайкоўскі, хоць назва невыпадкова адсылае нас да геніяльнага стваральніка лёгкіх фартэпіянных п'ес. І мэта, і адрасат, і тэма тут цалкам супадаюць. Беларускі «Дзіцячы альбом» — гэта зборнік 27 народных песень, якія спявалі калісьці бабулі нашым будучым мацярам і бацькам і якія, на жаль, наўрад ці чулі нашы дзеці.

Альбом запісаны дзвюма музычнымі сем'ямі: Змітром і Тамашом Сідаровічамі і Таццянай і Адасём Матафонавымі. Большасць гэтых песень прадстаўлена сучаснаму слухачу ў аўдыяварыянце ўпершыню.

«Пэўнае ўражанне на нас, як і на ўсіх у дзяцінстве, зрабілі дзіцячыя песенькі з савецкіх мультфільмаў. Даўно хацелася зрабіць нешта падобнае на беларускай глебе, — каментуе падзею Змітер Сідаровіч. — З іншага боку, альбом быў задуманы як карцінка беларускай сям'і, у якой бацькі пасля работы не ўнурваюцца моўчкі ў тэлевізар, а ўключаюць камп'ютар, расстаўляюць мікрафоны і разам з дзецьмі бяруць у рукі музычныя інструменты».

Так усё і было на працягу амаль двух гадоў працы над альбомам. Бацька і сын і іх сябры па дзіцячым садку — маці і сын — збіраліся разам увечары і выхадныя, адкрывалі фальклорныя зборнікі і... самі здзіўляліся таму, наколькі многа сонечных, вясёлых, паэтычных песень адрасавалі нашы продкі сваім маленькім дзеткам. Як лёгка і радасна іх спяваць і запамінаць, якія багатыя вобразы яны нараджаюць!..

«Адной з задач альбома было «звесці разам, пад адным дахам» дзве «народныя» традыцыі, — кажа Таццяна Матафонава, — вясковую, якая бярэ пачатак ад такіх інструментаў, як дуда, скрыпка, гармонік; і гарадскую, якая пачынаецца ад шасціструнай гітары.

Другой задачай было, не змяняючы аніводнай ноты ў народных матывах, — даць такія аранжыроўкі, каб архаічныя традыцыйныя песні весела і жыва гучалі ў рэаліях XXI стагоддзя».

Альбом адрасаваны для сямейнага праслухоўвання, а таксама для выкарыстання ў музычным выхаванні ў садках і школах.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокае спачуванне члену Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па адукацыі, культуры, навуцы і навукова-тэхнічным прагрэсе **Анішчук Ганне Тарасаўне** ў сувязі з напаткаўшым яе вялікім горам — **смерцю БАЦЬКІ**.

ЛІДСКАЯ «РЭВАЛЮЦЫЯ»: Дажынкі-2010

Замест балота — возера, замест старога пасёлка — сучасны праспект, замест сцежак — дарога з кветнікамі

Параўнанні таго, што адбывалася сёлета ў Лідзе, якая стане чатырнаццатай сталіцай рэспубліканскіх дажынак, з рэвалюцыяй мне давялося пачуць не ад аднаго мясцовага жыхара. І калі ўжо зараз завітаць сюды, цяжка ўявіць, што тут былі ўзарваны ўсе дарогі, горад быў акупаваны будаўнікамі (каля 5 тысяч чалавек), і цэнтр нагадваў суцэльнае поле бітвы за новую Ліду. За кароткі час тут было рэканструявана, адрамантавана і створана больш за дзве сотні аб'ектаў. Зносіліся старыя дамы, пашыраліся вуліцы, фарбаваліся фасады. За гэты час Ліда набыла не толькі новыя будынкі, напрыклад, той жа лядовы палац (дарэчы, юныя хакеісты днямі ўжо паспрабавалі лёд, ад чаго былі ў захапленні), тут з'явіліся новыя вуліцы — Грунвальдская, бульвар Гедыміна, праспект Перамогі. У Лідскім замку адноўлена вежа, а побач з ім з'явілася возера.

У апошнія пераддажыначныя выхадныя я завітала ў Ліду. Як для каго, а для мясцовых жыхароў выхадныя ўжо некалькі месяцаў паняцце ўмоўнае, добрая доля народа працуе па суботах. Я апытала больш за дзясятак жыхароў, і негатыву у водгуках амаль не было, мясцовыя разумеюць сітуацыю, лічаць, што крыху пацярпець нязручнасці трэба было, і яны вельмі радыя, што атрымалі новую, сучасную Ліду.

Сямейная пара, пенсіянеры Крэсла (Станіслаў Станіслававіч і Яўгенія Аляксадраўна) радуюцца:

— Мы ганарымся, што ў нашым горадзе адбудуцца Дажынкі. Вось тут дом, дзе мы жывём — з блакітнымі балконамі. Ён быў непрыметны, страшны, балконы былі рознымі. Цяпер да нас госці прыязджаюць і кажуць, што не туды трапілі, «гэта не ваш дом». Здзейснена рэвалюцыя па добраўпарадкаванні горада, чакаем з нецярпеннем свята, усіх запрашаем да нас...

Напачатку неадназначнае было стаўленне жыхароў да таго, што Ліда рыхтуецца да Дажынак. Былі і такія, што негатыўна адзываліся: розныя хадзілі чуткі — маўляў, што не паспеюць тут нічога зрабіць і Дажынкі перанясуць, і што іх наогул не будзе. У Маладзечне ужо зараз могуць пачынаць рыхтавацца да Дажынак. А ў нас горад добраўпарадкаваўся за вельмі кароткі час. Нават асобныя праекты не былі гатовыя, у працэсе праектаванне ішло, работы аператыўна ажыццяўляліся, даводзіліся па ходу іх узгадняць. Меліяратары на возеры, рабочыя на замку, у цэнтры горада, на вакзале працавалі ў некалькі змен. Бачылі б вы, як усё змянялася, гэта зямля і неба — што было і што стала. Ліда ўлічыла некаторыя гродзенскія памылкі. Мы баяліся, што пад пілу пойдзе шмат дрэў. Але тут няма такога, як напрыклад на гродзенскай Савецкай плошчы, — якая ўся ў бетоне. Праўда, калі пашыраліся вуліцы, і ў нас шмат дрэў пайшло пад корань, але горад застаўся зялёным.

— Можа, чэргі ў крамах сталі большымі, усё ж столькі будаўнікоў да вас прыбыла?

— Нічога такога, ніякіх праблем з гэтым не было. Хаця напачатку сярод мясцовых жыхароў было апасенне, ці не атрымаем мы якіх праблем у плане правапарадку, усё ж прыедзе столькі новага люду, і ці мала што пад шумок здарыцца. Але ніякіх эксцэсаў не было. Мы вельмі радуемся за наш горад, за тое, якім ён стаў. Вось пагуляйце. Падзівіцеся.

Слухаюся парады, іду па новым праспекце Перамогі. Не, Ліда не падобна на райцэнтр. Гэта куды круцей. Ды і цячэ гэтая людская плынь зусім не па раённых вуліцах — яны шырокія, прыбраныя, абапал дамы, як з малюнка — чыстыя, яркія. Прыезджыя дзівяцца і па-добраму зайздросцяць мясцовым.

(Заканчэнне на 6-й стар.)

РУП «ВИТЕБСКИЙ ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ» ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА по продаже имущества, обращенного в доход государства у РПУП «Витебский меховой комбинат»

Продавец: Комиссия по работе с имуществом, обращенным в доход государства при администрации Первомайского района г. Витебска.

Лот: Незавершенное строительством капитальное строение – скорняжно-пошивочный цех с участком выделки общ. пл. 5603,7 кв. м, расположенный по адресу: Витебск, ул. 2-я Прибережная, д. 1 с начальной ценой продажи* 637 554 000 рублей, задаток 63 755 400 рублей.

1. Аукцион состоится **25 октября 2010 года в 15.00** по адресу: Витебск, ул. Свидинского, 4. Заявления принимаются в рабочие дни с 8.00 до 17.00, а 25.10.2010 г. до 12.00 по адресу: Витебск, ул. Свидинского, 4. Заключительная регистрация участников с 14.30 до 15.00 по месту проведения аукционных торгов.

2. Аукцион проводится в соответствии с Положением «О порядке учета, хранения и реализации имущества, изъятого, арестованного или обращенного в доход государства», утвержденного Указом Президента Республики Беларусь от 04.09.2006 года № 559, и Положением, разработанным в РУП «Витебский институт недвижимости и оценки». Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Условия – наличие не менее двух участников. Порядок проведения аукциона и участия опубликован на сайте www.ocenka.by.

3. Для участия в аукционе приглашаются юр. лица всех форм собственности, индивидуальные предприниматели и физ. лица. Участнику необходимо подать заявление, подписать соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, предоставить заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка; юр. лица (резиденты Республики Беларусь) – доверенность представителя юр. лица (кроме случаев, когда юр. лицо представляет его руководитель), копии учредительных документов и свидетельства о гос. регистрации; представители физ. лиц (резидентов Республики Беларусь) – нотариально заверенную доверенность; индивидуальные предприниматели – копию свидетельства о гос. регистрации; юр. лица (нерезиденты Республики Беларусь) – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о состоятельности, выданный обслуживающим его банком или иной кредитно-финансовой организацией, с заверенным в установленном порядке переводом на белорусский (русский) язык; представители юридических и физ. лиц (нерезиденты Республики Беларусь) – легализованную в установленном порядке доверенность.

4. Сумма задатка перечисляется на расчетный счет № 3012215570013 в ГФ по Витебской области ОАО «Белинвестбанк» Витебска, ул. Ленина, 22/16, код 701. Получатель – РУП «Витебский институт недвижимости и оценки», УНП 390343677.

5. Имущество продается в собственность без передачи права собственности на земельный участок, на котором оно расположено. Окончательное решение об отводе земли принимается местными органами власти.

6. Победитель возмещает фактические затраты на организацию и проведение аукциона, которые сообщаются участникам до начала аукциона.

7. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с реализуемым имуществом.

** Начальная цена продажи утверждена без учета на добавленную стоимость.*

Контактные телефоны: 8 (0212) 435 435; 435 495; 8 (029) 591 00 02; 8 (029) 384 24 05, эл. почта: Vit.in@tut.by.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТЫХ АУКЦИОНОВ
Организатор аукциона: Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, пр. Черняховского, 9

Аукционы по продаже земельных участков в частную собственность для строительства и обслуживания жилого дома

№ лота	Кадастровый номер, площадь и адрес земельного участка	Функциональное назначение земельного участка	Характеристика расположенных на земельном участке инженерных коммуникаций и сооружений. Ограничения использования земель	Начальная цена земельного участка (бел. руб.)	Размер задатка и реквизиты для его внесения	Дата и время проведения аукциона	Окончательный срок подачи документов
1	Земельный участок с кадастровым номером 240100000003006446 площадью 0,1259 га, расположенный по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Рассветная, д. 31	Для строительства и обслуживания жилого дома	Возможность подключения централизованного газоснабжения, водоснабжения. Ограничения: охранная зона линии электропередач напряжением до 1000В.	15 907 591	1 590 700 бел. руб. на р/с 3642302000015 в филиале 201 ОАО «АСБ Беларусбанк», код банка 259, УНП 300200386, адрес банка: г. Витебск, ул. Гоголя, 8, получатель платежа: Витебский городской исполнительный комитет	25.10.2010 в 14.00.	19.10.2010 до 17.30.
1	Земельный участок с кадастровым номером 221288501601000074 площадью 0,2499 га, расположенный по адресу: Витебская обл., Витебский район, Туловский с/с, д. Огородники, ул. Придорожная, д. 3	Для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома)	Коммуникации отсутствуют. Ограничения: охранная зона линии электропередач напряжением до 1000В.	905 038	90 500 бел. руб. на р/с 3600314130016 в ф-ле № 201 ОАО «АСБ Беларусбанк», код 259, УНП 300971263, код платежа 04901, получатель платежа: Туловский сельский исполнительный комитет	04.11.2010 в 15.00.	29.10.2010 до 17.30.
2	Земельный участок с кадастровым номером 221280610601000133 площадью 0,2015 га, расположенный по адресу: Витебская обл., Витебский район, Бабиничский с/с, д. Подберезье, ул. Дальняя, 8	Для строительства и обслуживания жилого дома	Возможность подключения централизованного газо- и водоснабжения. Ограничения в использовании земель отсутствуют.	2 008 418	200 800 бел. руб. на р/с 3600314010019 в ф-ле № 201 ОАО «АСБ Беларусбанк», код 259, УНП 300594330, код платежа 04901, получатель платежа: Бабиничский сельский исполнительный комитет	04.11.2010 в 15.00.	29.10.2010 до 17.30.

Аукцион по продаже права заключения договора аренды земельного участка

№ лота	Кадастровый номер, площадь и адрес земельного участка, предлагаемого в аренду	Функциональное назначение земельного участка, срок аренды	Характеристика расположенных на земельном участке инженерных коммуникаций и сооружений. Ограничения использования земель	Начальная цена права заключения договора аренды (бел. руб.)	Размер задатка и реквизиты для его внесения	Дата и время проведения аукциона	Окончательный срок подачи документов
Сачыць за станам крыві (пры павелічэнні ўзроўню халестэрыну ў крыві ён немінуча пачне адкладвацца на сценках сасудаў, што закончыцца атэрасклерозам з мноствам яшчэ больш сумных наступстваў).

Падтрымліваць высокі тонус сасудаў (пры эластычных сасудах рызыка з'яўлення спазмаў або развіцця варыкознай хваробы з рознымі ўскладненнямі значна ніжэйшая).

Штодзень даваць сасудам дастатковы адпачынак (пастаянны высокі ціск на сценкі сасудаў можа аслабіць іх і прывесці да крывазлівіцця).

Каб сценкі вашых артэрый і вен заўсёды заставаліся трывалымі і эластычнымі, у рацыёне павінна быць удосталь вітаміна С (аскарбінавая кіслата) і Р (руцін). Арганізм чалавека не здольны сам выпрацоўваць аскарбінку, у дадатак яна вельмі хутка разбураецца. А руцін засцерагае аскарбінавую кіслату ад акіслення. Разам гэтыя рэчывы робяць сасуды больш эластычнымі, зніжаюць іх пранікальнасць.

Крыніцы вітаміну С: шыпшына, кізіл, чорныя парэчкі, рабіна, абляпіха, цытрусавыя, чырвоны перац, хрэн, пятрушка, зялёная цыбуля, кроп, ліставая салата, капуста, бульба, бручка.

Крыніцы вітаміну Р: цытрусавыя, абрыкосы, чорныя парэчкі, чарнаплодная рабіна, перац, грэчка, капуста, ліставая салата, памідоры, вінаград, шыпшына, маліна.

Таксама для сасудаў важныя вітаміны А (дапамагае арганізму супраціўляцца інфекцыі) і Е (антыаксідант, які перашкаджае акісленню вітаміну А і развіццю працэсаў утварэння таксічных свабодных радыкалаў). Яны разам засцерагаюць сасуды ад запаленчых працэсаў.

Крыніцы вітаміну А: рыбін тлушч, малако, масла, вяршкі, тварог, сыр, яечны жаўток.

Крыніцы вітаміну Е: нерафінаваны алей, прасткі пшаніцы, памідоры, салата, гарох, шпінат, пятрушка, шыпшына, семкі сланечніку, арахіс, міндаль.

Падрыхтавала Вольга КУЛІНКОВІЧ.

ДАРЭЧЫ?
сасудам пагражаюць:
- **гіпертанічная хвароба**
- **інфекцыйныя захворванні**
- **хранічныя запоры**
- **цяжарнасць**
- **стрэсы**
- **рэгулярныя інтэнсіўныя працяглыя фізічныя нагрузкі**
- **курэнне**
- **залішняя маса цела**
- **«стаячыя» прафесіі (прадаўцы, цырульнікі і г.д.)**
- **празмернае ўжыванне тлустых прадуктаў.**

Факт

А джыпа не дачакалася

Жанчына з Баранавічаў праз інтэрнэт вырашыла купіць джып «БМВ Х5». На адным сайце прапаноўвалі такі аўтамабіль за 3,5 тыс. долараў.

Каб атрымаць «БМВ Х5», неабходна было пералічыць грошы на банкаўскі рахунак. Долары жанчына пералічыла, а затым яшчэ дабавіла 1,5 тысячы, бо прадавец патэлефанаваў і прапанаваў больш дарагі «Фальксваген-Туарэг». Аўтамашыны жанчына не дачакалася, а тыя 5 тыс. долараў аселі дзесьці на Кіпры.

Калі ў доме нікога няма

У адзін з дамоў у Баранавічах зазірнула цыганка. Убачыла, што нікога няма і пачала загружацца — хапала самае каштоўнае.

Толькі смуглянцы не пашанцавала. Як толькі яна падалася да парога, з'явілася гаспадыня. Зладзейку ўдалося затрымаць.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

Ён + Яна

НЕ ПЕРАТВАРАЙЦЕ МУЖА Ў СЯБРОЎКУ

Ні ў якім разе не рабіце ГЭТАГА: не ператварайце мужа ў сяброўку! Гэта залатое правіла для сямейнага жыцця. Памятайце заўсёды: побач з вамі — мужчына! І гэтага мужчыну трэба спакушаць і заваёўваць кожны дзень.

На практыцы атрымліваецца інакш: жонка круціцца перад люстэркам і скардзіцца мужу, што «набрала» пяць кілаграмаў, выглядае жудасна і скура штосьці паблякла. Вярнуўшыся ад стаматолага, расказвае, што ў зубах дваццаць дзірак і наогул трэба збіраць на ўстаўную сківіцу. Або брэша абмяркоўваць з мужам набыццё антыцэлюлітнага крэму. Увогуле, робіць усё тое, што ў першыя дні знаёмства ні за што б рабіць не стала! Зразумела, калі жонка пачынае скардзіцца мужу, ёй хочацца, каб муж сказаў: «Дарагая, ты цудоўна выглядаеш!». Але мужы звычайна гэтага не кажуць. Ніякіх намёкаў у вашых словах яны не бачаць — яны вераць на слова. Калі жонка сказала, што яна старая, тоўстая, брыдкая, з цэлюлітам і карыесам, — так яно і ёсць. А каму хочацца класціся з такой жанчынай у пасцель? Вы дамагаецеся менавіта гэтага?..

Хваліце сябе, любімую, свайму каханаму мужу. Час ад часу даставайце цяжкую артылерыю для абнаўлення пачуццяў — старыя фотаздымкі шчаслівых гадоў, разам з мужам успамінайце сябе закаханымі і палкімі. Фліртуйце з мужам! Не ўпускайце магчымасці патанцаваць. Кажыце камплименты, смейцеся з яго жартаў, цалуйце ў вушка. Памятайце: ваша страсць нікуды не дзелася! Проста яна запылілася ад жыццёвых праблем. Здзімайце з яе пыл і радуйцеся жыццю!

УСЯ ПРАЎДА ПРА МУЖЧЫНСКІЯ ФАНТАЗІІ

Свет мужчынскай эротыкі змяніўся! Нядаўнія даследаванні навукоўцаў паказалі, што старыя стэрэатыпы ўжо не дзейнічаюць.

Мужчынскія фантазіі і жаданні больш не круцяцца вакол жаночай бялізны, рызыкоўных гульняў з наручнікамі, сэксу ўтраіх. І, дарэчы, дарэмна мы меркавалі, што іх заводзіць грубы сэкс. Сёння мужчыну патрэбныя ласка і прыгожыя словы. Большасць апытаных мужчын прызналіся, што іх узбуджае адна толькі думка пра магчымасць абгаварыць сэкс з сяброўкай. «Але яшчэ лепш, калі яна дакранаецца да мяне, распавядаючы пра тое, што будзе далей», — прызнаюцца мужчыны.

Такое разуменне, згодна з даследаваннямі, прыходзіць да 30 гадоў. Аднак амаль 60 % мужчын трымаюць свае жаданні пры сабе, паколькі баяцца адмоўнай рэакцыі сваіх каханак. Яны баяцца не адпавядаць стэрэатыпам, бо ўсім вядома, што мужчыны любяць «зрабіць гэта хутка». Ад страху яны лічаць за лепшае маўчаць, тлумачаць псіхолагі. Каханне, давер, шчасце — таксама важныя для нашых мужчын. Для прадстаўнікоў моцнага полу (гэтаксама, як і для жанчын) вельмі важная эмацыйная блізкасць. Сэксолагі зазначаюць, што пры такіх адносінах да сэксу задавальненне партнёркі становіцца для мужчыны ўсё больш важным.

ЗАМУЖ? ТОЛЬКІ ЗА ДВОЕЧНІКА!

Афіцыйна лічыцца, што мужчыны здраджваюць у тры разы часцей, чым жанчыны. Як мінімум адноўчы здраджвалі сваім жонкам трэць жанатых мужчын. «Настаўлялі рогі» сваім сужэнцам і ад 25 % да 33 % жанчын.

Брытанскія ж сацыёлагі зрабілі сенсацыйнае адкрыццё: чым больш адукаваны суб'ект, тым большая верагоднасць, што ён праявіць нявернасць у сямейных стасунках. Як высветлілася, самыя вернымі мужамі становяцца... двоечнікі. А высокаадукаваныя жанчыны і мужчыны ходзяць налева ў два разы часцей, чым тыя, хто атрымаў толькі сярэднюю адукацыю.

На думку даследчыкаў, гэта звязана з тым, што адукаваныя людзі, валодаючы матэрыяльнай незалежнасцю, маюць больш шырокі погляд на рэчы, а іх лад жыцця (офісы, аўтамабілі, казіно, падарожжы, сакратаркі) стварае ўсе ўмовы для разнастайнага інтыму «на баку».

Дарэчы, на праблему нявернасці мужчыны і жанчыны глядзяць зусім па-рознаму. Швейцарскія псіхолагі правялі цікавы эксперымент. Сотням сямейных пар яны задавалі адно і тое ж пытанне: што для вас лепш — каб ваш партнёр спаў з кім-небудзь іншым, але думаў пра вас, або, наадварот, спаў з вамі, а ўяўляў іншага чалавека? І высветлілася, што мужчыны аднадушна выбралі другі варыянт, а жанчыны, як ні дзіўна, першы: няхай, маўляў, спіць з іншай, але думае толькі пра мяне!

Падрыхтавала Вольга КУЛІНКОВІЧ.

«Цякла тут з лесу невялічка
Травой заросшая крынічка».
Якуб КОЛАС.

Крынічка

Рубрыку вядзе Валянціна ШПІЛЕЎСКАЯ, тэл. 285 88 81 № 34 (366)

Яблыня на месцы яблыні?

«Нам у спадчыну дастаўся ўчастак з садам, але дрэвы вельмі старыя, таму некаторыя мы вырашылі выкарчаваць і пасадзіць новыя. Чуў, што, напрыклад, яблыню нельга садзіць на месцы, дзе расла яблыня, а як з астатнімі дрэвамі?
М. КУШНЕР, *Уздзенскі раён.*

Перш за ўсё трэба памятаць, што многія садовыя культуры вельмі адчувальныя да стомленых глебаў. Мацней за іншы на гэта рэагуе яблыня, крыху менш — груша і айва. Сярод костачкавых пры паўторных пасадках асабліва рэагуе персік, менш — чарэшня, вішня, слівы, абрыкос. З ягадных вельмі дрэнна пераносіць пасадку на ранейшым месцы суніцы, а вось парэчкі і агрэст да стомленай глебы менш адчувальныя.

Спецыялісты-глебазнаўцы заяўляюць, што прычынай стомленасці глебы з'яўляецца накапленне ў ёй прадуктаў паўраспаду раслінных рэшткаў. У яблыневым садзе гэта фенольныя злучэнні, якія ўтвараюцца ў працэсе жыццядзейнасці мікраарганізмаў. Такім чынам, пры вырошчванні яблыні на адным і тым жа месцы некалькі гадоў накопліваюцца апалыя лісты, пялёсткі кветак, завязі пладоў, а таксама дробныя і буйныя галінкі і карані. У рэшце рэшт, раслінныя рэшткі ператвараюцца ў перагной і часткова мінералізуюцца, але для гэтага патрэбен час.

Пад дарослымі яблынямі раслінныя рэшткі кожны год папаўняюцца, а значыць, глеба «ўзбагачаецца» шкоднымі прадуктамі паўраспаду. І калі побач пасадзіць маладое дрэўца, яму будзе няўтульна.

Што можна параіць? Адразу пасля карчавання пладовага дрэва можна пасадзіць саджанец любой іншай пароды. Калі вы не хочаце мяняць на гэтым месцы іншую культуру, то на месцы карчоўкі 4-5 гадоў трэба вырошчваць аднагадовыя культуры або суніцы. А потым пасадзіць саджанец той жа раскарчаванай пароды. Можна скарыстаць гэты тэрмін да 3 гадоў, калі засеяць гэта месца сумессю чырвонай канюшыны і аўсяніцы лугавой або цімафееўкі. У канцы другога вегетацыйнага перыяду травы перакопваюць. У пачатку наступнага лета пасадзіце на гэтым месцы сідэраты — рапс або гарчыцу. Зялёную масу іх закапайце ў канцы лета, і тады саджанец можна будзе пасадзіць ужо вясной наступнага года. Існуе думка, што замест траў можна садзіць гародніну, але абавязкова ўносіць гной, які актывізуе жыццядзейнасць мікраарганізмаў у глебе.

Ёсць яшчэ адзін старадаўні спосаб паўторнай пасадкі не толькі яблыні, але і іншых дрэў пасля карчавання. Ім карысталіся садаводы яшчэ 100 гадоў таму. На месцы або побач з выкарчаваным дрэвам капаюць яму не менш як 70—80 см глыбінёй і каля 1 м у дыяметры. Яе запаўняюць свежай зямлёй з арганічнымі і мінеральнымі ўгнаеннямі. Зямлю можна прывезці з іншага месца або ўзяць са свайго ўчастка не бліжэй чым за 15 м ад дрэў, якія растуць. У гэтую глебу саджаюць саджанец, і атрымліваецца, што да моманту выхаду асноўнай масы яго карэнняў за межы ямы глеба адпачне і дрэву будзе не так маркотна. Відаць, можна выкарыстоўваць і іншыя варыянты, галоўнае — падыходзьце да гэтай справы творча.

«Аранжавы доктар» добра захаваецца да вясны

Гарбуз звычайны — аднагадовая бахчавая культура. Вядома каля дваццаці відаў і яшчэ больш разнавіднасцяў, якія адрозніваюцца знешнім выглядам і смакам. І нягледзячы на тое, да якога віду ці разнавіднасці адносіцца гарбуз, яго любяць і дарослыя, і дзеці. У яго смачныя не толькі семачкі і каша, гэта лякарства ад многіх хваробаў. Гарбуз садзейнічае добраму страваванню, лечыць запоры, а свежавыціснуты сок дапамагае пры бяссонніцы і трывожным сне. Ён прымяняецца і як мачагонны сродак.

Убіраюць гэту культуру да надыходу замаразкаў. Адзін-два тыдні даспяваюць на сонцы або ў сухім цёплым памяшканні, у выніку чаго скурка цвярдзее. У пладоў, якія выспелі як след, скурку можна парэзаць з цяжкасцю, толькі нажом, а калі гарбуз вялікіх памераў, то яго можна раздзяліць на часткі з дапамогай сякеры.

Для працяглага захоўвання адбіраюць здаровыя гарбузы сярэдняга памеру, якія добра выспелі. У адрозненне ад буйных пладоў, яны менш падвергнуты прарастанню насення ўнутры плода. Аптымальныя ўмовы захоўвання — на саломе пладаножкамі ўверх, так каб яны не дакраналіся адзін да другога. Лепш калі тэмпература, дзе захоўваюцца гарбузы, будзе ў межах 3—7 градусаў, а адносная вільготнасць паветра 60—75 працэнтаў. Але можна захоўваць гарбузы і ў цяні ў гарадской кватэры. У такіх умовах яны праляжаць да вясны. Вялікія і няспелыя гарбузы трэба выкарыстоўваць у першую чаргу для прыгатавання смачных і карысных страў. Іх можна запякаць, смажыць, запаніраваўшы ў муцэ, варыць кашу, а таксама марынаваць альбо перапрацаваць на гарбузова-яблычнае пюрэ і сокі, варэнне, цукаты і гэтак далей.

Яшчэ можна перасаджваць кветкі

КАЛІ вы не паспелі перасадзіць шматгадовыя кветкі, якія цвілі вясной і летам (касачы, півоні, лілеі, прымулы, флёкс шылападобны, дэльфініум, хоста, купальніца, лындыш, ясколка і інш.), зрабіце яшчэ ў гэтым месяцы.

Цыбульныя расліны, асабліва калі яны хварэлі, пратравіце 30—40 хвілін у растворы фунгіцыду (0,2 прац. фундазолу, 0,2 прац. тапсіну-М, 0,1 прац. імпакта або 0,4 прац. хлорвокіслу медзі) і прасушыце. Глебу перад пасадкай перакапайце (на штык лапаты) і запраўце перагнойнай зямлёй, мінеральнымі ўгнаеннямі (15 г аміячнай салетры, па 40 г калійных і фосфарных угнаенняў) і драўніннага попелу (200—300 г на 1 кв. м).

Спачатку пасадзіце дробнацыбульныя расліны — крокусы, стылы, мускары, падснежнікі, пушкініі і інш. У канцы верасня-кастрычніку — нарцысы, цюльпаны, гіяцынты. Да халадоў яны павінны ўкаранiцца. Глыбіня пасадкі цыбуліны ў сярэднім складае тры яе вышыні.

Прыбярыце на захоўванне клубні бягоній, карнявішчы кан, клубнецыбуліны гладыёлусаў і мантбрэцыі. Папярэдне прасушыце іх. Пры першых прыметах пашкоджання марозам выкапайце вяргіні, абразаючы сцёблы на 15—20 см вышэй за клубень. Сцёблы ў кан абрэжце, але глебу з карэнняў не стрэсвайце. Захоўвайце іх у такім выглядзе ўсю зіму.

Лілея — каралева кветнікаў

Ёсць гатункі, якія больш падыходзяць для ракарыя, іншыя — для клумбы. Характар лілей многім здаецца непрадказальным. Адны з іх растуць і пышна цвітуць, здзіўляючы гаспадароў сваёй непатрабавальнасцю, іншыя ў тых жа ўмовах хварэюць, не цвітуць, вымярзаюць. Чаму гэта адбываецца? Ды зусім проста. Нашы ўмовы падыходзяць не ўсім лілеям, нават тым, што ў нас прадаюць. Купляючы чарговы гатунак лілеі, пацікаўцеся, да якога класа ён адносяцца. Самыя капрызныя — усходнія лілеі. А вось лілеі азіяцкія, трубчастыя, мартагон, кандыдум цалкам прыстасуюцца да нашых умоў.

Апошнім часам з'явіліся новыя гатункі — гібрыды паміж гатункамі іншых класаў, такія як ЛА-гібрыды (з падоўжанай формай кветкі, скрыжаваныя з усходнімі). Іх таксама можна вырошчваць у адкрытым грунце.

Адны лілеі — азіяцкія, трубчастыя, усходнія гібрыды — любяць сонечныя мясціны, іншыя — з групы мартагон — можна вырошчваць толькі ў паўцяні і нават пры значным зацяненні. Па магчымасці прыгледзьцеся: калі на сцябле ёсць надцыбульныя карані, то гатунак аддае перавагу паўцяню.

Амаль усе лілеі не выносяць застою вільгаці, таму гліністыя шчыльныя глебы для іх не падыходзяць. У такія землі дадаюць пясок, перагной, торф і робяць дрэнаж. У бедныя глебы ўносяць перагной, але ні ў якім выпадку не свежы гной. Усе пажыўныя рэчывы і ўгнаенні дадаюць толькі ў здробненым выглядзе і перамешваюць з глебай. Пасля цвіцення для лепшага выспявання цыбулін пад лілеі ўносяць калійна-фосфарныя ўгнаенні: 30 г сульфату калію і 10 суперфасфату на 1 кв. м. Многая кветкаводы пры вырошчванні лілей выкарыстоўваюць драўнінны попел не толькі пры падрыхтоўцы глебы перад пасадкай цыбулін, але і на працягу сезона: праводзяць падкормкі выцяжкай попелу (100 г на 10 л вады).

Глыбіня пасадкі павінна ўтрая перавышаць вышыню самой цыбуліны. Праўда, гэта правіла агульнае і можа мяняцца ў залежнасці ад механічнага саставу глебы: на лёгкіх глыбіня загортвання цыбулін будзе крыху большая, на цяжкіх — меншая. У гібрыдаў і кандыдума глыбіня пасадак павінна быць мінімальнай.

Перад пасадкай цыбулін рэкамендуецца насыпаць на дно ямкі буйназярністы пясок, расправіць карані і засыпаць цыбуліны пяском, а потым зямлёй. Каб лілеі хутчэй укараніліся, пасадкі трэба добра паліць. Пасадкі, азіяцкіх гібрыдаў і ЛА-гібрыдаў мульчыруюць торфам або пілавіннем (5 см). Паколькі і торф, і пілавінне павышаюць кіслотнасць глебы, іх не выкарыстоўваюць у якасці мульчы пры вырошчванні лілей беласнежных, мартагон і трубчастых гібрыдаў. Гэтыя лілеі мульчыруюць лісцявым перагноем з дабаўленнем попелу.

Аптымальны тэрмін для перасадкі лілей — жнівень-верасень. Можна садзіць і пазней, калі тэмпература глебы блізкая да нуля, але ў гэтым выпадку давядзецца добра накрыць расліны на зіму.

Азіяцкія гібрыды можна перасаджваць на працягу ўсяго сезона і нават тады, калі яны цвітуць, толькі рабіць гэта трэба акуратна, каб не пашкодзіць карані. Пасля перасадкі лілей, якія цвітуць, патрабуецца шчодры паліў і прыцяненне.

Выкопваць цыбуліну на захоўванне трэба не раней чым пра 45 дзён пасля цвіцення, інакш яна не паспее аднавіцца і падрыхтавацца да зімы.

Фота БЕЛТА.

Гарбуз вагой 118 кг вырасціла на сваім прысядзібным участку віцябчанка Алена Кузняцова. Вышыня гарбуза склала 103 см, а ў акружнасці — 170 см.

Калі ў вас няма дома... для бульбы

Сталовыя буракі, бульбу можна захоўваць у звычайнай яме. Для гэтага падбіраецца сухое месца, якое вясной вада не павінна затапіць. Калі грунтовыя воды стаяць блізка, не трэба капаць глыбока, дастаткова зняць пажыўны грунт, а таксама крыху ворыўнага слоя. Калі ж месца высокае, можна зрабіць сховішча на глыбіні 1—1,5 м і абкласці яго з усіх бакоў дошкамі. На дне па перыметры трэба зрабіць сцёкавыя канаўкі, калі у сховішча раптам трапіць вада.У цэнтры ямы ўстанаўліваецца высокі шчыт, абвіты саломай. Ён паслужыць вентыляцыяй, з дапамогай якой у яму будзе трапляць паветра і выпарвацца вільгаць, што ўтвараецца пры дыханні клубняў.

Перад тым, як складваць бульбу ў яму, яе трэба перабраць, прасушыць. Калі бульба хварэла на фітафтору, клубні пасля ўборкі павінны прайсці каранцін на працягу месяца ў цёмным халаднаватым памяшканні, пасля гэтага трэба выкінуць захварэлыя клубні. Спецыялісты раяць складсці клубні ў сятчастыя мяшкі, — гэтак вы зберажаце іх ад грызуноў. Пасля таго як яма будзе запоўнена, яе укрываюць дошкамі і вялікім слоем саломы або лісця, зверху прысыпаюць пілавіннем і зямлёй. Вакол такога сховішча трэба пракапаць канаўкі для сцёку вады пасля дажджу, пажадана накрыць плёнкай або руберойдам.

Ва ўмовах гарадской кватэры бульбу можна захоўваць на зашклёнай лоджыі. Калі ёсць вялікая шчыльная скрыня ці старая кухонная шафа, абклейце ўсе сценкі пенапластам (ён добра ўтрымлівае цяпло), пакладзіце туды бульбу ў сятчастых мяшках або ў скрынках. Сачыце, каб тэмпература не зніжалася да нуля. Такім жа чынам можна захоўваць буракі, моркву.

Будзьце ўважлівыя да глебы

Калі няма магчымасці забяспечыць увесь участак арганічнымі ўгнаеннямі, то толькі ў градкі, прызначаныя пад капусту, агуркі, кабачкі і гарбузы, унясіце кампост з разліку 3-4 кг на квадратны метр. А ў астатнія запраўце траву, апалыя лісты пладовых культур. Арганічныя ўгнаенні «працуюць» некалькі гадоў. З іх, у адрозненне ад мінеральных, не вымываюцца пажыўныя рэчывы.

* * *

Перакопваючы цяжкія гліністыя і сугліністыя дзярнова-падзолістыя глебы, укладвайце пласт да пласта, не разбіваючы кома. Пры такой апрацоўцы зямля лепш прамерзне, а ад марозу загінуць лічынкі і кукалкі шкодных насякомых.

* * *

Не перакопвайце глебу са снегам. Гэта запаволіць яе прагравanne вясной.

* * *

На заліўных поймах, дзе глебы цяжкія, увосень зямлю лепш не узорваць: да вясны яна стане яшчэ больш шчыльнай, а ўрадлівы слой знясуць паводкавыя воды. У такіх месцах зямлю варта толькі неглыбока прарыхліць.

Кватэрнае пытанне

ВЫПАДАК... АЛЕ ЦІ ТОЙ?

Наша сям'я доўга стаяла ў чарзе на паляпшэнне жыллёвых умоў. А калі яе дачакаліся (пачалі будаваць кватэру ў ЖБК), муж захварэў, стаў інвалідам. Кажуць, што ў такіх выпадках сям'і павінна выдзяляцца дадатковая плошча і аказвацца дапамога ў пагашэнні крэдыту. Ці так гэта?
А.П., *Ляхавіцкі раён.*

Наяўнасць права на дадатковую плошчу па стане здароўя павінна ўлічвацца пры вызначэнні канкрэтнага памеру льготнага крэдыту, што выдзяляецца гэтай сям'і на будаўніцтва кватэры.

У адпаведнасці з падпунктам 1.6 Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 14 красавіка 2000 г. № 185 нарміруемыя памеры агульнай плошчы жылога памяшкання, якое ўзводзіцца, для вызначэння велічыні льготнага крэдыту ўстанаўліваюцца (з разліку на аднаго члена сям'і) для грамадзян, якія будуюць жылыя памяшканні ў гарадах і пасёлках гарадскога тыпу, а таксама ў шматкватэрных жылых дамах у сельскіх населеных пунктах, — 20 кв. метраў (пры будаўніцтве для аднаго чалавека аднапакаёвай кватэры — 36 кв. метраў).

Грамадзянам, якія валодаюць у адпаведнасці з заканадаўствам правам на дадатковую плошчу жылога памяшкання па стане здароўя, указаныя нарміруемыя памеры агульнай плошчы жылога памяшкання павялічваюцца на 15 кв. метраў на кожнага члена сям'і, які мае права на дадатковую плошчу жылога памяшкання.

Пералік захворванняў, што даюць асобам, якія пакутуюць ад іх, права на атрыманне дадатковай плошчы жылога памяшкання, вызначаны ў дадатку 1 да пастановы Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь ад 19.04.2001 г. № 27 (у рэдакцыі пастановы ад 20.04.2006 г. № 25).

Медыцынскую экспертызу на наяўнасць захворванняў, пры якіх прызнаецца немагчымым сумеснае пражыванне з асобамі, якія пакутуюць ад іх, у адным пак

Глыбінка

«ЖЫВЁМ СВАЁЙ СЯМ'ЁЙ»

ТАЦЦЯНА і Юрый ЗАРЭЦКІЯ, маладая сям'я з вёскі Гайшын, выхоўваюць чацвярых дзяцей, сваіх і прыёмных.

Чырвоныя вароты на цэнтральнай вуліцы Гайшына: іх упрыгожваюць падкова на шчасце і смешныя драўляныя каты, зробленыя рукамі дзяцей і іх бацькоў. Вялікая бяроза са шпакоўняй, на хаце вісіць тэлевізійная талерка, яркімі познімі кветкамі цвітуць флёксы, арка завітая вінаградам.

Гаспадарам гэтага падворка, Таццяне і Юрыю, яшчэ няма і 30 гадоў. Іх гісторыя знаёмства і кахання кароткая і звычайная: жылі ў адной вёсцы, хадзілі ў адну школу, закахаліся і пажаніліся. Усё як у людзей: праца ў сельскай гаспадарцы, двое дзяцей — старэйшы хлопчык і дзяўчынка, хата з агародам і кветнікам, падсобная гаспадарка.

Аднак сям'я Зарэцкіх усё ж незвычайная: нядаўна Таццяна і Юрый узялі да сябе ў сям'ю двух прыёмных хлопчыкаў: 4-гадовага Дзімку і Алёшу, якому днямі спаўняецца толькі год ад нараджэння.

— Я пачула гісторыю ад сваячкі, што два хлопчыкі засталіся без мацярынскай апекі, — расказала Таццяна. — Маці іх хворая і не можа іх выхоўваць. Такі лёс у дзяцей! І калі б мы іх не ўзялі, дзеці, верагодна, трапілі б у інтэрнат. Стала шкада, асабліва маленькага Лёшу. Ды і Дзіма вельмі добры хлопчык.

Жанчына не хавае, што яны з мужам шмат думалі, перш чым вырашыцца стаць прыёмнымі бацькамі. З аднаго боку, сельская праца не самая даходная, цяжка і сваіх уласных дзяцей падымаць. З іншага боку, дзяржава клапоціцца пра апекуноў і гарантуе жанчыне заробак выхавальніцы.

— Нам проста захацелася дапамагчы дзецям, ім сапраўды была патрэбна дапамога, — па-мужчынску сціпла кажа Юра.

— Нічога, мы дзяцей любім: выгадуем, здолеем, — усміхаецца яго жонка.

Калі не ведаць, што ў кампаніі Зарэцкіх ёсць прыёмныя дзеці, то і не здагадаешся: нейкім чынам усе яны падобныя на Таццяну і Юру. Самы малодшы, Лёша, засынае ў мужчыны на руках. Аленка і Дзімка дэманструюць гасцям свае самыя любімыя цацкі — катоў. Кот з арыгінальнай мянушкай Радыска на руках малога хлопчыка: падобна, жывёла скарылася са сваім лёсам і не пратэстуе супраць чарговых абдымкаў.

Аленка — маленькая прыгажуня, чые выявы ў казачных строях упрыгожваюць хату. У акружэнні трох братоў яна адчувае сябе прынцэсай.

Дзеці кінулі катоў і пайшлі да коз. Яны ведаюць, што козы даюць смачнае і карыснае для іх малако. А вось маленькая і крыху шкодная казачка Маруся — яшчэ адна забаўка для малых. Стасік, усмешлівы хлопчык з вяснушкамі, пільна сочыць за малодшымі: для 11-гадовага ён проста неверагодна адказны, самы галоўны памочнік таты і маці.

— Я бульбу з бацькамі капаю, кабачкі збіраю, ваду ў лазню нашу, — старанна пералічвае свае абавязкі. — Працы хапае. Я прыязджаю першым рэйсам са школы, раблю ўрокі, а калі малыя вяртаюцца з дзіцячага садка — займаюся з імі. Гуляю з Лёшкам, пакуль маці ежу ўсім гатуе.

Стасік спакойна тлумачыць, што з новымі братамі, вядома, працы ў яго дадалося, але ён не супраць:

— З Дзімкам штодня гуляем у футбол, гэта ж весела ў кампаніі! А цяжкасцяў у жыцці я не баюся. Хачу стаць выратавальнікам у МНС. Мне падабаецца дапамагаць людзям.

Актуальны клопат Юры і Таццяны — забяспечыць сваю вялікую сям'ю ежай, адзеннем і ўвогуле ўсім неабходным.

— Гэта са сваёй гаспадаркі, — паказвае Юра. — Мы вырошчваем свіней, здаём іх, і за кошт гэтага выжываем. Сёлета хоць і не самы ўраджайны год на кабачкі быў, але 5 тон здалі, усё ж дадатковая капейка. Таму што на заробак механізатара ў 300 тысяч рублёў складана пражыць, самі разумееце.

— У нас агарод у 40 сотак, — працягвае Таццяна. — Бульба, агародніна. Усё сваё, сваімі рукамі вырашчанае. У Слаўгарадскім раёне дзейнічае праграма, якая дапамагае сялянам зарабляць на развіцці падсобных гаспадарак. І мы ў яе межах заняліся клубніцамі: набылі 9 гатункаў у Мінску, навучыліся іх даглядаць. Нібыта атрымалася: выдаткі склалі 180 тысяч рублёў, а прадалі ягады на 300 тысяч.

— Пракормім дзяцей сваімі сіламі, — падводзіць вынік бацька. — Будзем рабіць націск ва ўласнай гаспадарцы адразу на ўсё — свіней, кабачкі, клубніцы і што яшчэ будзе даваць даход. Будзем працаваць, колькі сіл хопіць.

Вёска Гайшын, дзе жывуць Зарэцкія, пацярпела ад чарнобыльскай аварыі. Людзі з'ехалі ад радыяцыі, але перасяленцы напрыканцы 1990-х сталі вяртацца на радзіму. Гайшын быў аб'яўлены рэабілітаванай тэрыторыяй, тут пачало адраджацца жыццё. Цяпер у вёсцы жыве болей за паўсотню чалавек, аднак маладых сем'яў зусім мала. Зарэцкія гавораць, што і ім, магчыма, давядзецца падумаць аб пераездзе бліжэй да цывілізацыі: у Гайшыне зачынілася пошта, а цяпер мясцовыя жыхары хвалююцца за краму.

— Але што б ні адбывалася навокал, мы жывём самі сабе, сваёй сям'ёй, — прабуе растлумачыць сваю жыццёвую філасофію Таццяна. — У нас вельмі згуртаваная сям'я, і чым больш цяжкасцяў — тым болей мы яднаемся.

Каб не засумаваць у надзённых клопатах, Зарэцкія бяруць актыўны ўдзел у розных конкурсах для маладых сялянскіх сем'яў. Апошні з іх — на ўзорны падворак.

— Не, я не лічу свой падворак узорным, — усміхаецца Таццяна, — але як толькі вольная хвіліна ўдаецца — раблю, каб было прыгожа. І, ведаеце, часу хапае. Гэта толькі падаецца, што чацвёра дзяцей і прысесці няма калі. Я спрытная, раблю ўсё хутка. Так, часам няма настрою рабіць, але — трэба, бо больш няма каму.

Таццяна кладзе Лёшу спаць і назірае, як дзеці падносяць ката да клеткі з папугаем, каб выклікаць рэакцыю птушкі. Аказваецца, Кеша, яшчэ адна хатняя забаўка малых, гаворыць, і ў такіх выпадках павінен сказаць: «Псік! Кеша — харошы!» Аднак на публіцы папугай размаўляць відавочна не хоча.

— Я вельмі радая, што муж мяне падтрымаў наконт дзяцей, — жанчына глядзіць на малога, які раскінуўся ў сне. — Лёша ў першы дзень, як мы яго прывезлі, навучыўся рабіць «ладачкі» і ўжо сказаў «Дай-дай!» Самага маленькага мы, зразумела, найбольш шкадуем. Ну як такую ляльку можна не пашкадаваць?..

Зарэцкія, узяўшы ў дом прыёмных дзяцей, не збіраюцца перарываць іх сувязі з сапраўднай маці. Таццяна гаворыць, што яна не здольная гэтага рабіць — ні па кантракце, ні па-чалавечы. Яны зычаць жанчыне здароўя і будуць гадаваць дзяцей. «І што б ні здарылася, мы іх не кінем!» — цвёрда заявілі бацькі з Гайшына.

Ілона ІВАНОВА. Фота аўтара.
Слаўгарадскі раён.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	6.58	19.04	12.06
Віцебск —	6.48	18.53	12.05
Магілёў —	6.48	18.54	12.06
Гомель —	6.45	18.50	12.05
Гродна —	7.14	19.19	12.05
Брэст —	7.14	19.20	12.06

Месяц
Поўня 23 верасня.
Месяц у сузор'і Авена.

Імяніны
Пр. *Фядоры, Віктара, Германа, Дзмітрыя, Мікалая, Сяргея.*
К. *Марыны, Яніны, Герарда, Германа, Тодара.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

НАДВОР'Е на заўтра

ГРОДЗЕНСКІ «КОСМАС» — АДЗІН З САМЫХ «КРУТЫХ» КІНАТЭАТРАЎ У БЕЛАРУСІ

Такое меркаванне выказаў журналістам дырэктар КУП «Гроднааблкінавідэапракат» Іван КАЛБАСКА напярэдадні старту новага праекта. У суботу 25 верасня гродзенцы ўпершыню ўбачаць кіно ў 3D-фармаце, які дазваляе выкарыстаць усе сучасныя тэхналогіі і сёння лічыцца самай відовішчнай сістэмай кінапаказу.

У «Космасе устаноўленыя вельмі якасны, самы сучасны праектар, вялікі экран са спецыяльным сярэбраным пакрыццём. Білет на дзённы сеанс у 3D-фармаце будзе каштаваць 15 тысяч рублёў, а на вячэрні — 18 тысяч.

— Хочам, каб гродзенцы адчулі, як кажуць, кайф ад такога фармату (гэта тое, што не ўбачыш дома), і часцей хадзілі ў кіно, — зазначае Іван Калбаска. — Яны змогуць убачыць усё, што будзе выпускацца па гэтай тэхналогіі. А першым стане фільм «Прыстанак зла».

Дарэчы, акуляры, якія будуць выкарыстоўвацца ў «Космасе» падчас кінапаказу ў 3D-фармаце, вызначаюцца мінімальнай стратай святла. Прычым пастаянным кліентам будзе прадастаўлена магчымасць набыць персанальныя акуляры.

Услед за «Космасам» сістэмы 3D будуць устаноўленыя ў лідскім кінатэатры «Юбілейны» і ў гродзенскім «Кастрычніку». Да канца сёлетняга альбо ў пачатку наступнага года такія кіназалы, вакол якіх сёння бум ва ўсім свеце, з'явяцца практычна ў кожнай вобласці, паведаміў **дырэктар сумеснага беларуска-аўстрыйскага прадпрыемства «Крафтверк» Аляксандр ХАНДОГІН**.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

ІДЗЕ АДЛОЎ РЫБЫ І...

Прырода Палесся зачароўвае сваёй прыгажосцю і непаўторнасцю. І кожны раз, калі супрацоўнікі Ганцавіцкай міжраённай інспекцыі па ахове жывёльнага і расліннага свету запрашаюць з сабою ў рэйд, з задавальненнем выкарыстоўваю гэтую магчымасць.

На гэты раз разам з **начальнікам інспекцыі Міхаілам ПІШЧОМ і інспектарам Русланам ХІЛЬКО** выехалі на патруляванне водных угоддзяў рыбгаса «Лактышы». Там на першай нагульнай сажалцы якраз завяршыўся адлоў рыбы, якая не поўнасцю выбіраецца з вадаёма. Менавіта ў гэты перыяд з'яўляецца шмат ахвотнікаў ухапіць лёгкую здабычу. Прыехаўшы на месца, Р. Хілько і адзін з вартаўнікоў рыбгаса засталіся ў засадзе каля шлюзу сажалкі, а М. Пішч са мною, каб не свяціцца на машыне і не губляць дарэмна часу, вырашыў паглядзець, што робіцца ў рэспубліканскім балотна-журавінавым заказніку «Борскі», а гэта недалёка ад рыбгаса — каля вёскі Чудзін.

У раёне існуе некалькі рэспубліканскіх заказнікаў — «Борскі», «Ялоўскі», «Падвялікі мох» і частка «Выганашчанскага», апошні знаходзіцца адразу на мяжы трох раёнаў. Усе яны сапраўдныя жамчужыны Палесся — некранутыя куткі прыроды з усёй яе ўнікальнай разнастайнасцю флоры і фаўны. Таму і знаходзяцца пад асаблівай аховай дзяржавы. Думалася, што заехаўшы ў заказнік «Борскі», акунёмся ў цішыню і спакой, але мясцовасць была напоўнена гоманам. Людзі вярталіся з журавін — цягнулі іх на спіне і на веласіпедах.

Але ўразіла не гэта. Праехаўшы на машыне ў глыбіню лесу, знайшлі побач з лясной дарогай



паляну, забруджаную смеццем: пластыкавымі бутэлькамі, шматкамі паперы... Тут людзі стварылі імправізаваную аўтастаянку, што катэгарычна забаронена рабіць у заказніку. М. Пішчу прыйшлося складаць пратаколы на вадзіцеляў аўтобуса і дзвюх легкавушак, якія прывезлі людзей у ягады. І які падняўся лямант! Зборшчыкі журавін абступілі «Уазік», і на начальніка інспекцыі пасыпаліся з усіх бакоў праклёны, абразы і... просьбы. Маўляў, не ведалі, што знаходзімся на тэрыторыі заказніка і што тут забароненая стаянка аўтатранспарту. А людзі з аўтобуса, які замовіла адно з прадпрыемстваў Салігорскага раёна для паездкі сваіх супрацоўнікаў па журавіны, нават расказалі, што быццам бы згубілі жанчыну і цяпер шукаюць яе. Вось таму так доўга і стаіць аўтобус у заказніку. Але ж, як толькі пратакол быў падпісаны, яны адразу з'ехалі. Вось і думай: пакінулі кабету на волю лёсу ці падманвалі?

Сітуацыя неадназначная. Людзі мелі пэўную рацыю. Рэч у тым, што на ўездзе ў заказнік хоць і ёсць шыльда, але яна някідкая, так што на яе ніхто і ўвагі не звяртае. Ды і прачытаць, што тут знаходзіцца заказнік, магчыма толькі з блізкай адлегласці. А пра аўтастаянку перад уездам у заказнік і размова не ідзе — яе няма. Даволі дзіўна, што ДЛГУ «Ганцавіцкі лясгас», які адказвае за парадак на тэрыторыі рэспубліканскіх заказнікаў і ставіць вялікія каляровыя шыльды з назвамі сваіх ляснічтваў, тут не прыняў ніякіх захадаў для нармальнага наведвання заказніка. Адсюль і засмечанасць лесу.

З аднаго боку, заклікаем любіць і шанаваць прыроду, а з другога — недастаткова пра яе клапоцімся.

Пакідаліся заказнік у даволі сумным настроі: яшчэ не адышлі ад пачутага ў свой адрас. Але тут патэлефанаваў Руслан Хілько, які з вартаўніком рыбгаса прасядзеў у засадзе ўжо 4 гадзіны: «Затрымалі злодзея. Хутчэй прыязджайце!»

Нагульная сажалка № 1 знаходзіцца на ўскрайку рыбгаса, і туды даволі лёгка трапіць незаўважаным — дастаткова толькі перайсці па водмелі абводны канал. Менавіта на ім інспектар і затрымаў «рыбака», які кінуў мех з украдзенай рыбай і спрабаваў уцячы. Так што Руслану давялося пабоўтацца ў вадзе, каб выцягнуць яго на бераг. Злодзеем аказаўся жыхар Клецкага раёна. І хоць напачатку ён вёў сябе даволі агрэсіўна, але калі астыў, то пачаў прасіць прабачэння. Дарэчы, бывалі выпадкі, калі затрыманыя, зразумеўшы, што іх чакае, нават на калені станавіліся.

Пакуль складалі пратакол, паступіў сігнал ад вартаўнікоў рыбгаса. На чацвёртай нагульнай сажалцы «арудуе» Яша са сваёй «бандай». Асоба даволі адметная — толькі сёлета ён ужо тройчы пападаўся на крадзяжы рыбы, а нядаўна за гэта адсядзеў 25 сутак адміністрацыйнага арышту. Але, як той казаў — «гарбатага выправіць магіла».

Усю кампанію ўбачылі ў бінокль — яна ішла па дарозе. Каб злавіць аматараў дармавой юшкі, прыйшлося наладзіць сапраўдную аблаву. Два вартаўнікі спыніліся на машыне побач з дарогай, якая пралягае паміж дзвюх сажалак, а інспектары пабеглі ў абход вадаёма, каб зайсці з тылу. Я бег следам з «мыльніцай» і думаў: «Ваўка ногі кормяць», але калі праз кіламетр нагнаў сапавіцу, то не пазайздросціў рабоце інспектараў. Калі ж выйшлі на кампанію, то аказалася, што «Яша» і яго два сябры і не думалі ўцякаць. Яны паспелі добра выпіць і цягнулі мех з карпам ды яшчэ адзін — з некалькімі бутэлькамі гарэлкі. Кампанія даволі вольна адчувала сябе на тэрыторыі рыбгаса. Напачатку злодзеі паводзілі сябе нахабна, і адзін з іх — Аляксандр Ш., таксама добра вядомы міліцыі, пачаў пагражаць інспектарам і вартаўнікам. Трэцім у кампаніі быў грамадзянін Расійскай Федэрацыі, які таксама пражывае ў райцэнтры. Каб дакладна ўстанавіць яго асобу і супакоіць Аляксандра Ш., вырашылі даставіць вясёлую тройцу ў раённы аддзел міліцыі. Пасадзілі іх у машыну і паехалі. І вось дзіва! Чым бліжэй пад'язджалі да горада, тым больш лагоднымі станавіліся затрыманыя. Ш. пачаў прасіцца, а «Яша» ўспомніў жонку і дзяцей. Калі б не перагар, то падалося б, што ў машыне не парушальнікі, а ахвяры.

У міліцыі «Яшу» і расіяніна адпусцілі, а Аляксандра Ш. вырашылі пасадзіць у камеру, але ён уцёк. Ну што тут зробіш...

Толькі выехалі за горад, як зноў патэлефанавалі з рыбгаса. На адной з сажалак затрымалі яшчэ аднаго злодзея, які палез па рыбу з сачком. У час адлову рыбы да сажалак рыбгаса злятаюцца аматары дармаўшчыны не толькі з навакольных вёсак, але і з іншых раёнаў. І гэтаму жыхару Клецкага раёна не пашчасціла.

Варта адзначыць, што вартаўнікі рыбгаса не маюць тых правоў, якія ёсць у інспектараў, і без падтрымкі інспекцыі па ахове жывёльнага і расліннага свету ўвогуле не змаглі б эфектыўна працаваць.

Вось так нервова прайшоў гэты рэйд. Раніцой мы вярталіся ў райцэнтр не без задавальнення.

* * *

Інспекцыя займаецца не толькі тымі, хто «затаварваецца» на сажалках рыбгаса — гэта невялікая частка іх работы. А ў асноўным даводзіцца кантраляваць тэрыторыю некалькіх раёнаў. Нейкі тыдзень таму затрымалі машыну з украдзеным лесам, а яшчэ раней абсушкодзілі цэлую групу браканьераў з незарэгістраванымі стрэльбамі. А колькі такіх груп ужо было... Незаконны адстрэл звера і адлоў рыбы — звычайная з'ява, з якой даводзіцца сутыкацца інспектарам. На жаль, рэйды немагчыма праводзіць штодня...

Павел СВІСТУНОВІЧ.
Фота аўтара.
Ганцавіцкі раён.

24 верасня

Дзве даты

1955 год — Вярхоўны Савет БССР зацвердзіў тэкст і музыку Дзяржаўнага гімна Беларускай ССР (словы М. Клімковіча, музыка Н. Сакалоўскага).

1989 год — Папа Рымскі Ян Павел II рэабілітаваў Галілея Галілея, прызнаўшы рашэнне суда інквізіцыі 22 чэрвеня 1633 года памылковым. Ён публічна прынёс прабачэнні вучонаму і вярнуў яму права «быць законным сынам царквы». Высветлілася, што на працягу дзевяці апошніх гадоў жыцця, да самай смерці, Галілей накіроўваў пісьмы рымскаму папу, абвяргаючы бязбожнасць, у якой яго абвінавацілі.

Цытата дня:

«Абсалютна лішняя справа — завадзіць размову пра сябе: вас абмяркуюць, як толькі вы пакінеце кампанію».
Уілсан Мізнер (1876—1933), амерыканскі драматург.

ІМЯ Ў ФАЛЬКЛОРЫ

Генетычныя вытокі імянарачэння сігаюць у глыбокую даўніну, у тыя часы, калі ўзнікла неабходнасць сямейна-родавай або родава-племяннай ідэнтыфікацыі асобы.

● Фальклорная спадчына і найперш казачны эпас шырока адлюстравалі традыцыю называць герояў не прамымі, а ўскоснымі імёнамі, у аснове якіх ляжыць шырокае асацыятыўнае поле. Героя маглі назваць па найбольш выразных акалічнасцях вонкавага выгляду: заяц — даўгавухі, мядзведзь — крывалапы, куртач, кароткахвосты, ліса — рыжая, воўк — шэры.

● Самымі старажытнымі па паходжанні з'яўляюцца імёны, у якіх фіксіраваліся сакральныя прыродных стыхій (Гром з Маланнёй, Мароз Марозавіч), аб'ектаў навакольнага пакланення (Дуб-Дубавік, Дубін-Багатыр, Вярнідуб, Гарын-Багатыр, Гара-Гаравік). Блізка да іх стаяць імёны герояў казак пра жывёл, у якіх кола дзеючых персанажаў ахоплівала і звяроў-татэмаў, і хатніх жывёл.

● Імёны ў чарадзейных казках сталі адлюстраваннем міжкласавых, унутрысаслоўных і ўнутрысямейных адносінаў: Партупей Прапаршчык, Дзеўка-Красаўка, дзедава дачка Галя, бабіна дачка Юля, Ганька-гулянька, Сцяпан-шавец, Васіль Васільевіч, Марцін Глінскі-Папялінскі, карова Рыся, Бурэня.

● Сваімі імёнамі адасоблены «той» свет, які процістаіць чалавеку: Змей Гарынавіч, Цуда-анціюда Беззаконная галава, Салавей-разбойнік, Баба Яга-Касцяная нага (надзвычай цікавае імя, яно двухсастаўнае, таму што гэта казачная істота паядноўвае дзве прасторы: свет жывых — Баба, а свет памерлых — Касцяная нага). Адметнасцю чарадзейных казак з'яўляецца і тое, што герой атрымлівае імя па сваім паходжанні: Суччын сын, Івашка-Мядзведжае вушка, Кабылін сын. Самым распаўсюджаным у казках з'яўляецца імя Іван, якое амаль што заўсёды дапаўняецца ёмістай характэрнай рысай, у якой закадзіраваны сэнс сюжэтнага дзеяння: Іван-царэвіч, Іван-Дараган, Ванька, Іванка-прастачок.

● У больш позняй фальклорнай традыцыі і абрадавай практыцы вакол імені сфарміравалася цэлая сістэма прадпісанняў, рэгламентацый і перасцярог. Сярод беларусаў існаваў універсальны прынцып унутрыродавай перадачы імені праз пакаленне: унукам давалі імёны дзядоў. Імя бацькі давалі толькі ў выключных выпадках: калі дзіця нараджалася ў вялікае свята, у гонар якога ў свой час хрысцілі бацьку; калі ў сям'і паміралі, «не гадаваліся» дзеці, то наступнаму нованароджанаму наўмысна давалі імя бацькі — няхай наступным памірае ён, а сын застаецца і працягвае род. Калі ж дзеці паміралі і далей, то ўключалі самы моцны варыянт родавай перасцярогі — хлопчыку давалі імя першага чалавека свету — Адам, а дзяўчыне — першай жанчыны — Ева.

● Не давалі нованароджаным імёны самагубцаў, заўчасна загінулых людзей. Блізнятам давалі блізкія, але ўсё ж розныя імёны. Абавязковым таксама лічылася тое, што імёны хросных бацькоў не павінны супадаць з імёнамі родных бацькоў, нельга, каб супадалі імёны жаніха і першага шафера, нявесты і першай шаферкі, хроснага бацькі і хрэсьніка.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

Ну і ну!

ПАДМАНУЎ СТРАХАВУЮ КАМПАНІЮ НА 28,5 МІЛЬЁНА

50-гадовы жыхар Полацкага раёна здолеў падмануць вядомую страхавую кампанію, якая дзейнічае ў Беларусі, дзе застрахаваў свой аўтамабіль.

Як паведаміў «Звяздзе» **пракурор аддзела па наглядзе за следствам у органах унутраных спраў пракуратуры Віцебскай вобласці Валерый СЦЯПАНАЎ**, ураджэнец далёкага Азербайджана, які мае беларускае грамадзянства, два разы трапіў у аварыю, апошнюю з якіх учыніў спецыяльна.

Спачатку ў Полацку ягоная «Хонда» ўрэзалася ў «Пежо», які быў прыпаркаваны. Віноўнік здарэння з'ехаў з месца аварыі, не выклікаў супрацоўнікаў Дзяржаўтаінспекцыі. Потым знайшоў уладальніка машыны, у якую ўрэзаўся, і аплаціў траты, панесеныя за рамонт. Толькі б у міліцыю не заяўляў...

Літаральна праз некалькі тыдняў хітры кіроўца на дарозе Лепель — Полацк — мяжа Расійскай Федэрацыі імітаваў дарожна-транспартнае здарэнне. Ягоная машына апынулася ў кюветы, дзе ўрэзалася ў дрэвы. На гэта раз выклікаў ДАІ, паказаў пашкоджанні на машыне, якія з'явіліся на аўто падчас сутыкнення з прыпаркаваным аўто ў Полацку. У ДАІ, пакалькі пра гэта не ведалі, спакойна выдалі адпаведную даведку, якую застрахаваны ўладальнік аўто перадаў у сваю страхавую кампанію. Там яму і выдалі больш за 28,5 мільёна рублёў. Але потым у ДАІ зацікавіліся зноў яго аўто. Знайшліся і сведкі, якія расказалі, што мужчына гаварыў ім пра хітрую камбінацыю...

За свае дзеянні аўтамабіліст прыгаворам суда быў пазбаўлены волі тэрмінам на 3 гады з адтэрміноўкай адбывання пакарання на два гады без канфіскацыі маёмасці. Пры вынясенні прысуду было ўлічана тое, што яшчэ падчас следства падсудны кампенсаваў страхавой кампаніі фактычна скрадзеныя ў яе грошы.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Шчыра віншуем **з юбілеем Ірыну Уладзіміраўну МАКАРЭВІЧ** з Магілёва.
Жадаем здароўя, шчасця, дабрабыту і верных сяброў.
Сям'я Шлыкаў з Карэлічаў.

Усміхнемся!

На вяселлі кінолагаў п'яны гарманіст дзве гадзіны граў на шарпеі...

☺

Суд.

— Чаму вы атруцілі суседзяў?

— Мне ў краме сказалі, што лепш труціць прусакоў разам з суседзямі.

☺

У краме. Вялікі кошт, а адыходзіць няма куды. Ззаду — жонка.

☺

Дыялогі ў сеціве.

— У цябе бываюць прыступы ляноты?

— У мяне бываюць прыступы актыўнасці, лянота ў мяне пастаянная.

☺

Анфіса Чэхава ведае пра сэкс усё, а ўладальнікі «Жыгулёў» ведаюць пра сэкс усё і яшчэ крыху.

Та-ак, зноў гаспадар рыбкі «чалавіў»... 0,7 прыблізна..

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 33.310. Індэкс 63850. Зак. № 4673. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12